Інв. 2650
Трэцяцкая бібліятэка імя Горкага

ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дарожным дадаткам „Прафрух")

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасля тэксту—50 к., Іншагародняя абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаванні—скідка. Звыш тэрміну, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. надбавку.

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74
Сакратар	6-19
Партсэктар	13-60
Сэктар інфармацыі	13-60
Начны рэдактар	6-42
Галоўная кантора	7-81
Аддзел падпіскі	7-81
„ абвестак	7-81

ПАНЯДЗЕЛАК, 1 верасьня 1930 г.
№ 204 (3802)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

Стаць на чале калгаснага руху

Зрабіцца сапраўднымі бальшавіцкімі арганізатарамі новага калгаснага прыліву

«Перавагі буйное гаспадаркі даюць магчымасьць ужо ў першую вясну падагнаць у калгасах даход бедняка да серадняцкага ўзроўню і адначасова ўзьняць агульны ўзровень даходу серадняка», — заявіў на XVI зьезьдзе партыі тав. Якаўлеў, падагульваючы рэзультаты першай калгаснай сяўбы. — «Вось чаму серадняк ідзе ў калгасы. Вось а чаго выходзяць нашы разьлікі, што серадняк цалкам пойдзе ў калгасы».

Наша рэчаіснасьць кожны дзень і кожную гадзіну апраўдвае гэтыя словы. Новы прыцёк адзінаасобнікаў у калгасы, новая моцная цяга да буйное абагуленае гаспадаркі зрабілася рэальным фактам. Усё больш і больш рэзка выяўляюцца перавагі калектываў, усё вырaзьней і выразьней відаць бязвыхаднасьць барбарскага гаспадараньня на вузкіх палосках адзінаасобнага падзелу. Жыцьцё---за **наш шлях** пераробкі дробнае гаспадаркі, жыцьцё—за **наш лёзунг** суцэльнай **калектывізацыі.**

На старонках сёнешняга нумару **«Зьвязды»** чытач знойдзе дакумант, выключны па выразнасьці свайго зьместу. Гэта—справаздача аб змычцы калгасьнікаў **«Паростка сацыялізму»** са сваімі суседзямі адзінаасобнікамі. Учытайцеся ў яго, удумайцеся і перад вамі ва ўвесь рост паўстане штодзённае гэраічнае і слаўнае змаганьне, якое вядзецца дзесяткамі тысяч калгасьнікаў за новую сацыялістычную беларускую вёску.

«Паростак сацыялізму» арганізаваў пераклічку. Учарайшы, сёнешні і заўтрашні калгасьнікі рабілі справаздачу ў сваёй рабоце, параўноўвалі вынікі сваёй веснавой сяўбы. І вось сёнешні адзінаасобнік, які яшчэ ўчора хістаўся, ня верыў у перавагу аграмаджанае працы, ня бачыў нічога далей сваёй убогай палоскі і пераконаны ў адвечнасьці ідыётызму вясковага быцьця, — гэты адзінаасобнік сам выступае заядлым агітатарам за калгас.

Паслухайце:

— Мы сабралі 5,6 цэнтнараў жыта з дзесяціны, вы — калгасьнікі—12,7; у нас ½ зямлі займаюць межы, бур'янам зарасьлі нашы палоскі, у два разы менш бульбы дала наша зямля, —у два разы больш атрымалі вы даходу... Мы бачым зараз, куды былі накіраваны кулацкія хітрыкі...

«Паростак сацыялізму» давёў сваю жыцьцяздольнасьць. Показам калгаснае працы ён стварыў спрыяючыя ўмовы для новага ўздыму калгаснага руху ў наўкольных вёсках.

Але аднаго гэтага мала. Аднэй цягі ў калгас не даволі. Трэба было гэту цягу арганізаваць, трэба было скарыстаць абстаноўку, якая спрыяла росту калгасаў.

Калгас «Паростак Сацыялізму» і яго суседзі па Рэчыцкім раёне — «Гігант», імя Сталіна і імя Калініна пайшлі да адзінаасобнікаў, дапамагалі ім, працавалі рука аб руку з імі, і ў выніку — новыя парасткі сацыялізму на вёсцы, новыя апорныя пункты аграмаджанае працы. Машыны «Паростка сацыялізму» працавалі на палёх вёскі Сьвідэры, «Гігант» дапамагаў беднаце і малазаможным сераднякам Холміцкага сельсавету, калгас імя Сталіна забясьпечыў вёску Васілевічы насеньнем і рабочай сілай і г. д. З калгасаў ідуць чырвоныя абозы дапамогі заўтрашнім калектывістым. 14 калгасных станцый з малатарнямі і іншымі сельска-гаспадарчымі машынамі прыступілі да абмалоту хлеба адзінаасобнікаў. 137 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак уступілі ў гэтыя калгасы за апошнія два тыдні. Кожны дзень прыносіць новыя заявы. Новыя калгасы нарадзіліся поруч з «Паросткам сацыялізму».

Зараз праводзіцца рад ударных кампаній — уборка ўраджаю, асеньняя сяўба, хлебазагатоўкі. Гэтыя кампаніі павінны быць скарыстаны для новага росту калгаснага руху. Загатоўкі хлеба, сяўба і ўборка зусім ня будуць тармазіцца масавай работай, упартым змаганьнем за новыя калгасы. Наадварот, пасьпяховы ход іх цесна зьвязаны з калектывізацыяй. **Толькі на аснове калектывізацыі, толькі на аснове сацыялістычнай пераробкі вёскі мы даб'емся рашаючых посьпехаў на фронце гаспадарчага будаўніцтва.**

Гэта зразумелі калгасьнікі Рэчыцкага раёну, якія выйшлі насустрач новай калгаснай хвалі. Гэтага не разумеюць, ці правільней ня хочуць разумець правыя апартуністы з Клімавіцкіх раённых арганізацый, якія ставяць рагаткі ці нават забараняюць прыём новых членаў у калгасы.

Усім вядомы клімавіцкі калгас **«Ленінскі шлях»**, — буйнейшы ў БССР, які лічыцца ўзорным. І вось гэты калгас часова **адмовіўся ад прыёму адзінаасобнікаў.** Раённы партыйны камітэт санкцыянаваў праваапартуністычную пастанову праўленьня калгасу. «Ленінскі шлях» не адзінокі. Яго прыкладу пасьледаў калгас **«Камінтэрн».** Наогул, як паведамляе наш брыгадзір, усе **калгасы раёну падзяляюцца на «адкрытыя» і «закрытыя».** Другія адгарадзіліся ад адзінаасобнікаў, замкнуліся ў сабе, першыя не адштурхоўваюць тых, хто стукае ў іх дзьверы...

Клімавіцкая рэчаіснасьць — яркая ілюстрацыя праваапартуністычнай практыкі, яшчэ нязжытай некаторымі арганізацыямі. Клімавіцкія пастановы — грозны сыгнал, грознае папярэджаньне. Кулак праз сваіх агентаў ажыцьцяўляе сваю кулацкую праграму зрыву калектывізацыі. Клясавы вораг рукамі правых капітулянтаў тармозіць пераўтварэньне БССР у рэспубліку суцэльнай калектывізацыі.

Чым-жа, як не дапамогай клясаваму ворагу, можна назваць зрыў праграмы па арганізацыі першапачатковых вытворчых аб'яднаньняў? Іх важнасьць, іх значэньне для далейшага лёсу калектывізацыі ўсім вядомы са шматлікіх партыйных дакумантаў. Ня гледзячы на гэта, старшыня райкалгассаюзу таго-ж Клімавіцкага раёну яшчэ 17 жніўня заяўляе аб непатрэбнасьці вытворчых аб'яднаньняў. Пя гледзячы на гэта, у БССР арганізавана толькі 229 таварыстваў — 14 проц. пляну гэтага году.

Чым-жа, як не злачынная бязьдзейнасьцю, якая ў цяперашніх умовах мяжуе з правым апартунізмам, можна лічыць тыя сапраўды чарапашыныя тэмпы падрыхтоўкі да сяўбы, сьведкамі якіх мы зьяўляемся? Кантрактацыя фактычна правалена, насенныя фонды сабраны толькі на 10 проц., калгасы задыхаюцца ад адсутнасьці ўгнаеньня, а побач горы нескарыстанай вапны. Калгасы чакаюць кіраўніцтва, а ў некаторых цэнтральных і раённых установах адпускная ліхаманка. Сяўба ўжо распачалася, а да ачысткі збожжа толькі прыступаюць. І на гэтым фоне сьпячкі, безадказнасьці, якія ёсьць у радзе раёнаў, яскрава вызначаюцца трывожныя паведамленьні з Дрысенскага раёну аб пастанове паасобных калгасаў скараціць засеўную плошчу з-за тэхнічнай непадрыхтаванасьці.

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б, якая друкуецца ў сёнешнім нумары «Зьвязды»,—апошні напамінак, апошняе папярэджаньне ўсім, хто не разумее, ці ня хоча зразумець важнасьці неадкладнага павароту тварам да калгаснага руху.

ЦК КП(б)Б канстатуе, што «паасобныя зьвеньні партыйных, савецкіх і калгасна-каапэрацыйных арганізацый праяўляюць недаацэнку значэньня асеньняй засеўнай кампаніі, правільнага разьмеркаваньня ўраджаю, арганізацыі працы ў калгасах, пасьпяховага правядзеньня хлебазагатовак і неабходнасьці мабілізацыі ўсіх сіл партыйных арганізацый, каб стаць на чале ўжо распачатага новага прыліву бядняцка-серадняцкіх мас у калгасы». Вышэйшы кіраўнічы орган партыі патрабуе ад усіх арганізацый, каб яны, «вядучы рашучае змаганьне супроць праваапартуністычнага самацёку і лева-ухілісцкага адміністраваньня ў калгасным руху, цесна зьвязвалі арганізацыю прыліву ў калгасы з уборкай ўраджаю, асеньняй сяўбой і зрывам ворагаў кулацкіх элементаў на вёсцы».

Стаць па чале калгаснага руху, зрабіцца сапраўднымі бальшавіцкімі арганізатарамі новага калгаснага прыліву, — вось задачы, якія павінны сабе паставіць усе нашы арганізацыі, усе члены нашай партыі.

Мы напярэдадні новых вялікіх баёў, новых рашаючых штурмаў. Два лягеры стаяць адзін супроць аднаго. «Паросткі сацыялізму», «Гіганты» і сотні, тысячы іншых калгасаў над кіраўніцтвам рабочае клясы і яе партыі ідуць у новы паход за сацыялістычную вёску. **Яны зьмятуць з твару зямлі ўсіх, хто чапляецца за старое, усіх, хто тармозіць іх пераможны поступ. БССР павінна быць і будзе рэспублікай суцэльнай калектывізацыі, кулацтва павінна быць і будзе ліквідавана. Паросткі сацыялізму вырастуць у сацыялізм.**

Кангрэс пралетарскага контр-наступленьня закончыў сваю работу

Заключнае пасяджэньне V кангрэсу Прафінтэрну

МАСКВА, 30. Заключнае пасяджэньне кангрэсу заслухала даклад мандатнай камісіі. На V кангрэсе Прафінтэрну прысутнічаюць 538 дэлегатаў, з іх 299 з



рашаючым і 239 з дарадчым голасам. На кантрэсе прадстаўлена 60 краёў.

З дэклярацыямі выступілі прадстаўнікі Фінляндыі і Гішпаніі. Прадстаўнік Фінляндыі адзначае памылкі фінляндзкіх рэвалюцыйных прафсаюзаў. Гэтыя памылкі,—гаворыць ён,—дазволілі фашыстыам беспакарана задушыць рабочы рух і ўвесьці дыктатуру фашысцкага кулака. Прадстаўнік Гішпаніі паведамляе, што дэлегацыя Гішпаніі на V кангрэс Прафінтэрну была арыштавана перад яе ад'ездам. Але,—гаворыць ён,—тэрор фашызму ня змог перашкодзіць таму, каб я прыбыў сюды вітаць вас ад імя гішпанскіх рабочых.

Пад бурныя воплескі і пяяньне «Інтэрнацыяналу» і «Чырвоны Сьцяг», аднагалосна прымаецца рэзалюцыя аб задачах рэвалюцыйнага прафруху. Дэлегаты з песьнямі і крыкамі «ура» выходзяць на вуліцу сустракаць маскоўскіх рабочых, якія дэманстравалі ў гонар кангрэсу.

АДЧЫНЕНЬНЕ ПАВЕТРАНАЙ ЛІНІІ БЭРЛІН—МАСКВА—УЛАДЗІВАСТОК

МАСКВА. Адчыненьне паветранай лініі Бэрлін — Масква — Уладзівасток адбудзецца ў пачатку будучага году. Уся вялізарная работа па пабудове Сібірскай паветранай магістралі ажыцьцёўлена Савецкім Саюзам без замежнай дапамогі, усяго ў два — два з паловаю гады.

ТЭХНІЧНАЯ БАЗА ДЛЯ РАЕНАЎ

МАСКВА. У сувязі з пастановай ЦК УсеКП(б) аб рэарганізацыі сеткі газэт, з прычыны ліквідацыі округ, начальнік паліграфкамітэту ВСНГ СССР Чэрапаў паведаміў супрацоўніку ТАСС, што друкарні існуюць зараз прыблізна ў 600 пунктах, аднак ня ўсе яны прыстасаваны для выпуску газэт. Перад паліграфічнай прамысловасьцю стаіць задача забясьпечыць друкарскім абсталяваньнем і рабочай сілай 30% усіх раённых газэт. Гэта значыць трэба арганізаваць каля 200 новых невялікіх друкарань. Арганізацыя друкарань павінна быць выканана ў асноўным за лік абласных рэсурсаў.

Востра стаіць пытаньне забясьпячэньня часткі рэарганізаваных і ўжо створаных друкарань шрыфтамі і абсталяваньнем. У цяперашні час рад слаўлітняў пераключылі сваю работу па выробе 150 камплектаў шрыфту новых раённых газэт. Гэтыя камплекты будуць гатовы да 1 кастрычніка.

З прычыны недахопу рабочае сілы, мясцовым арганізацыям трэба неадкладна прыступіць да падрыхтоўкі новых кадраў рабочых. Раённыя газэты, не забясьпечаныя мясцовымі друкарнямі, будуць выпускацца ў друкарнях, тых раёнаў, што знаходзяцца недалёка.

Пераможна ідзе наперад Кітайская Чырвоная армія

ЧАНША АБКРУЖАНЫ ЧЫРВОНЫМІ ВОЙСКАМІ

ШАНХАЙ, 30. Барацьба за Чанша разгараецца з новай сілай. Чырвоныя войскі занялі горад Ліпін (у 30 клм. ад Чанша) і пагражаюць Чанша. Пінцьзян пакінуты ўрадавымі войскамі. Такім чынам, Чанша абружаны з усіх бакоў чырвонымі часьцямі. У Чанша згуртоўваюцца буйныя вайсковыя сілы панкінскага ўраду. Войскі камандуючага ваеннымі сіламі правінцыі Хунань аказваюць моцнае супраціўленьне чырвоным, аднак, сілы панкінцаў занадта абмежаваны і ў некаторых мясцох іх перадавыя лініі абароны вельмі слабы. Японскае агенцтва заяўляе, што 8-тысячнай армії будзе вельмі цяжка абараніць Чанша ад наступаючай 20-тысячнай Чырвонай армії.

УЦЯКАЮЦЬ Ў ПАНІЦЫ

ШАНХАЙ. З Ханькоу ўвесь час прыбываюць пераноўненыя бежанцамі параходы. Японскае консульства Чанша загадала японскім прэзыдэнтам эвакуавацца, «калі становішча стане пагражаючым».

ПЕРАД ТВАРАМ ЧЫРВОНАЙ НЕБЯСЬПЕКІ

ШАНХАЙ. У Кітай прыбыў для інспэкцыі японскага флёту на водах Янцзы японскі адмірал Кавано. Галоўная мэта прыезду Кавано «абарона японскіх грамадзян у Ханькоу і ў іншых партох у выпадку далейшых непарадкаў».

10-тысячная Чырвоная армія, якая знаходзілася ў раёне Хуанху заняла горад Шайн і пагражае цяпер Шашы (на поўдзень ад правінцыі Хубэй). Чан-Кайшы зьвярнуўся да генэралаў, якія ўваходзяць у паўночны блёк, з просьбай зрабіць уплыў на Фын Юй-Сяна і Ен-Сі-шана, каб яны неадкладна спынілі ваенныя дзеяньні. Чан Кай-шы матывуе сваю просьбу тым, што камуністычная небясьпека і эканамічны крызіс у краіне ўзмацняецца.

Антысавецкая дэманстрацыя на Чорным моры

Нядвузначныя камэнтары да пан-эўрапэйскай камэды

ФРАНЦУСКАЯ ЭСКАДРА Ў РУМЫНСКІМ ПОРЦЕ

ВЕНА, 30. Паводле вестак з Бухарэсту, у бліжэйшыя дні ў румынскі порт Канстанцу чакаецца прыбыцьцё некалькіх французкіх суднаў. Гэта наведваньне арганізавана ў процівагу нядаўняму наведваньню Румыніі ангельскай эскадрай. Адначасова яно прадстаўляе сабой антысавецкую дэманстрацыю.

ЗАКОНЧЫЎСЯ «АГРАРНЫ» СПЭКТАКЛЬ ВОРАГАЎ СССР

ВАРШАВА, 30. Мяркуюць, што варшаўская канфэрэнцыя закончыць сваю работу яшчэ сёньня. Пасьля закрыцьця канфэрэнцыі дэлегаты зробяць паездку па Польшчы.

ПЕРАДВЫБАРНАЯ «БОМБА» АЎСТРЫЙСКІХ САЦЫЯЛ-ФАШЫСТЫХ

ВЕНА. Пленум ЦК аўстрыйскай сацыял-дэмакратычнай партыі прыняў «праграму дзейнічаньня», у якой сацыял-фашыстыя патрабуюць, каб у мэтах зьмяншэньня беспрацоўя былі прыняты меры аздараўленьня аўстрыйскай народнай гаспадаркі для неадкладнага ўвядзеньня манаполіі на збожжавыя прадукты. Апроч таго, высоўваецца патрабаваньне, каб крэдытаваньне савецкіх заказаў Аўстрыі адбывалася-б пад гарантыяй аўстрыйскага ўраду, а не гарантыяй венскага муніцыпалітэту, як было да гэтага часу.

Дэмагагічным цэнтрам цяжару «праграмы дзейнічаньня» зьяўляецца патрабаваньне аб правядзеньні ўсенароднага галасаваньня па пытаньні аб устанаўленьні спэцыяльнага падатку ў карысьць беспрацоўных. Газэта аўстрыйскага фінансавага капіталу разглядае гэту праграму выключна, як дэмагічны гэст у сувязі з надыходзячымі выбарамі.

Орган аўстрыйскай кампартыі «Ротэ Фанэ» заяўляе, што праграма зьяўляецца першай перадвыбарнай «бомбай» сацыял-дэмакратыі. Газэта паказвае, што патрабаваньне аб увядзеньні манаполіі на збожжавыя прадукты служыць толькі інтарэсам абшарнікаў і кулакоў і нанясе моцны ўдар па шырокіх працоўных масах, бо прывядзе да падарожаньня прадуктаў харчаваньня.

Манаполія зьявіцца мерапрыемствам накіраваным супроць СССР, бо фашысцкі дзяржаўны апарат будзе па сваім жаданьні рашаць, якія краі могуць увозіць у Аўстрыю збожжавыя прадукты.

Газэта падкрэсьлівае, што чысьцейшай дэмагогіяй зьяўляецца таксама патрабаваньне сацыял-фашыстых аб урадавых гарантыях савецкіх заказаў, бо сацыял-дэмакратычная партыя вядзе цкаваньне па ўсім краі супроць гандлёвай дзейнасьці СССР у Аўстрыі.

МАШЗНЬНІЦКІ ТРУК ГЕНСАВЕТУ

ЛЁНДАН, 30. Да надыходзячага 1-га верасьня адкрыцьця кангрэсу трэд-юніёнаў генсавет выпусьціў справаздачу аб сваёй дзейнасьці. У разьдзеле «Беспрацоўе» справаздачы вялікі разьдзел адданы пытаньні «Гандаль з СССР». Сярод мерапрыемстваў па барацьбе з беспрацоўем, якія падаваў генсавет у якасьці асноўных, паказаны два: разьвіцьцё гандлю Антліі з калёніямі і садзейнасьць ажыўленьню ангельскага гандлю Антліі з калёніямі і гандлю з СССР.

Генсавет ў сваёй справаздачы піша, што пытаньне аб прадастаўленьні СССР доўгатэрміновых крэдытаў складаў адну з галоўнейшых клапот асобнага камітэту аж да моманту здачы справаздачы у друк. Камітэт гэты лічыць, што камітэт па экспартных крэдытах не забясьпечвае адпаведнага разьвіцьця гандлёвых адносін з СССР. Гэтым абмяжоўваецца барацьба генсавету супроць беспрацоўя, і па лініі прыцягненьня савецкіх заказаў у Англію. Іншыя мерапрыемствы зводзіліся да паліатыўных мер, якія нічога, акрамя далейшага росту беспрацоўя, не далі.

«НЯ ЎСТУПАЦЬ У БЛІЗКІЯ АДНОСІНЫ З СССР—ЗЛАЧЫНСТВА СУПРОЦ НАШЫХ ІНТАРЭСАЎ»

РЫГА. Газэта «Пэдэя Брыдзі» пе друкуўвае артыкул лібаўскай газэты «Стрэднэку Авізэ» аб гандлёвай палітыцы Латвіі. У 1м паказваецца, што б жузныя латвійскія палітыкі вели раўнадушна адносяцца да разьвіцьця гандлёвых адносін Латвіі з Савецкім Саюзам. Паводле слоў газэты, «гэтая палітыка перашкаджаюць Савецкаму Саюзу выконваць савецка-латвійскі дагавор. Савецкі Саюз зьяўляецца нашым гаспадарчым тылам і ня ўступаць СССР у больш блізкія адносіны, а весьці ў адносінах да яго няпрыязную палітыку, значыць рабіць злачынства супроць нашых гаспадарчых інтарэсаў і незалежнасьці. Латвійскі ўрэд вельмі глупа паступіў, паведаміўшы сваёй згодзе прыняць удзел у варшаўскай канфэрэнцыі». У заўвазе да гэтага артыкулу «Пэдэя Брыдзі» піша: «Мы пераконаны, што вынікі варшаўскай канфэрэнцыі ня варты таго, каб дзеі іх псавалі нашы адносіны з Нямеччынай, Савецкім Саюзам і Літвой.

У фашысцкай Польшчы

ПОЛЬСКАЯ ДЭФЭНЗЫВА РАЗАГНАЛА ДЗІЦЯЧЫ ДОМ

ВАРШАВА, 29. Гэтымі днямі польская дэфэнзыва зрабіла налёт на выхаваўчы дом у Коле (Лёдзінскае ваяводзтва), які належыць каапэрацыйнаму саюзу «Спалем». У выхаваўчым доме на сродкі каапэрацыйнага саюзу ўтрымліваліся і навучаліся дзеці палітэмігрантаў, пры чым «закон божы» не выкладаўся. Палітычная паліцыя, врабіўшы налёт на дзіцячы дом, вывезла ўсіх дзяцей (ва ўзросьце ад 4 да 10 год) і адправіла іх у каталіцкі выхаваўчы дом у Ліскове. Кіраўнікам каапэрацыйнага выхаваўчага дому было прапанавана ліквідаваць яго ў 24 гадзіны. Дзеці вывезены пад канвоем паліцыі, пры чым іх сілай вырывалі з рук выхавацеляў. Кіраўнікі каапэрацыйнага выхаваўчага дому неадкладна выехалі ў Варшаву і адправілі дэлегацыю да міністра працы Прыстора са скаргай на незаконныя дзеяньні паліцыі. Прыстор дэлегацыю ня прыняў. Двум маткам, якія зьявіліся ў Ліскоў за сваімі дзецьмі, было адмоўлена ў гэтым.

ЗГОДНА «АБЯЦАНЬНЯМ» ПІЛСУДСКАГА АФІЦЭРЫ «ДАЮЦЬ ПА ШЫІ ДЭПУТАТАМ

ВАРШАВА, 30. На віцэ-старшыню сойму, лідэра сялянскай партыі Я Домбскага зрабілі напад некалькі афіцэраў. Домбскі зьбіты ля парога сваёй кватэры. Адначасова зроблены напад і нацыянал-дэмакратычнага дэпутата Вічака.

—ПРАВАЛІЎСЯ ВАЕННЫ ПЕРАЛЁТ

ВАРШАВА, 30. Польскі апазыцыйны друк рэзка нападае на ваеннае міністэрства за няўдала арганізаваны пералёт польскіх ваенных самалётаў, якія пры малі ўдзел у пералёце самалётаў краёў Малай Антанты па маршруце Варшава-Прага-Белград-Бухарэст-Варшава. Рэзультаты пералёту зьяўляюцца для Польшчы надзвычай сумнымі. З 6 самалётаў усяго 2 замаскілі пералёт. Адзін польскіх лётнікаў разьбіўся на-сьмерць. У сувязі з гэтым начальнік польскага авіяцыі Рэйскі падаўся ў адстаўку.

Пастановы бюро ЦК КП(б)Б

АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ

1. Заслухаць паведамленьне Наркамасьветы, ВСНГБ, Наркамзему, НК аховы здароўя аб падрыхтоўцы да навучальнага году, бюро ЦК КП(б)Б канстатуе, што цяперашні стан падрыхтоўкі да навучальнага году стварае пагрозу сваячасоваму пачатку заняткаў. Несваячасовае забясьпячэньне навучальных устаноў кіруючымі і настаўніцкімі кадрамі, адпаведным кантынгентам студэнцтва, асабліва пэдустаноў і саўбуду, незабясьпячэньне навучальных устаноў адпаведнай навучальнай і жыльлёвай плошчай, адсутнасьць патрэбных мерапрыемстваў па арганізацыі харчаваньня студэнцтва.

2. Такі стан падрыхтоўкі да навучальнага году зьяўляецца, галоўным чынам, вынікам недаацэнкі задач па падрыхтоўцы кадраў як з боку цэнтральных зацікаўленых устаноў, так і адпаведных мясцовых выканкомаў і саветаў.

3. З боку ЦК ЛКСМБ ня былі ўжыты належныя захады да мабілізацыі камсамольцаў у пэд. інстытут, ня гледзячы на дадзеныя ЦК КП(б)Б дырэктывы.

4. Прафсаюзнальныя саюзы ў сваёй штодзённай рабоце не аддавалі патрэбнай увагі справе падрыхтоўкі кадраў, з прычыны чаго сярод паступаючых у ВНУ не забясьпечана адпаведная кольькасьць рабочых.

5. Бюро ЦК КП(б)Б канстатуе, што з боку культпропу ЦК справе кіраўніцтва, разгортваньню новага навучальнага году было аддадзена мала ўвагі, да апошняга часу ня былі ўжыты захады да сыгналізацыі перад бюро ЦК КП(б)Б аб сапраўдным становішчы падрыхтоўкі да навучальнага году.

6. З боку БДВ ня было прынята выстарчальных мер у галіне своячасовага забясьпячэньня сеткі народнае асьветы падручнікамі, навучальнымі прыладамі і асабліва праграмамі.

7. Большасьць АК КП(б)Б і РК КП(б)Б ня выканалі дырэктыў ЦК КП(б)Б аб падрыхтоўцы да навучальнага году.

Бюро ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1) Культпропу ЦК, разам з аддзелам кадраў, у пяцідзённы тэрмін забясьпечыць кіраўнічымі кадрамі ВНУ і тэхнікумы.

2) У мэтах забясьпячэньня пачатку навучальнага году, будаўніцтва і рамонт навучальных устаноў скончыць да вызначаных тэрмінаў. Пабудову інтэрнатаў скончыць да 1-га кастрычніка. Прапанаваць ВСНГБ, Дзяржпляну, Бел. канторы Саюзлесу і будаўнічым арганізацыям пад асабістую адказнасьць кіраўнікоў гэтых устаноў забясьпечыць будаўніцтва і рамонт навучальных устаноў і інтэрнатаў будаўнічымі матар'ямі.

Наркампрацы цалкам забясьпечыць будаўніцтва рабсілай і пічыць гэтае будаўніцтва ўдарным.

3) Абавязаць ЦК ЛКСМБ выканаць заданьне аб мабілізацыі ў пэд. навучальныя ўстановы 1.500 чалавек ЦСПСБ разгарнуць работу па вярбоўцы ў ВНК праз фабзаўкомы.

4) Прапанаваць фракцыі БКС у дадкадны тэрмін правесьці ўсе мерапрыемствы па арганізацыі харчаваньня студэнцтва.

5) Прапанаваць рэдакцыям цэнтральных газэт штодзённа асьвятляць ход падрыхтоўкі да навучальнага году, узяўшы пад кантроль выкананьне пастановы ЦК КП(б)Б, ЦКК і СНК па разгортваньні падрыхтоўкі да навучальнага году.

6) Прапанаваць БДВ не пазьней 15 верасьня 1930 г. выдаць падручнікі для масавай школы, строга захоўваючы пасьлядоўнасьць у выданьні падручнікаў першай неабходнасьці (чытанкі і інш.).

7) Прасіць ЦКК РСІ сыстэматычна правяраць работу ўсіх устаноў па падрыхтоўцы да навучальнага году, выяўляючы вінаватых у невыкананьні дырэктыў партыі і ўраду па разгортваньні навучальнага году і прыцягваць вінаватых да суровай адказнасьці.

За бальшавіцкае вырашэньне праблемы кадраў

Партыя высунула праблему кадраў, як адну з асноўных праблем нашага сацыялістычнага будаўніцтва. З усёй бальшавіцкай непрымірымасьцю, змагаючыся з наскокамі правых на лінію партыі ў гэтым пытаньні, партыя змагалася і будзе змагацца і надалей за сапраўднае бальшавіцкае вырашэньне праблемы кадраў.

Бязумоўна, вялікую ролю ў вырашэньні гэтай праблемы адыгрывае своячасовая падрыхтоўка да навучальнага году.

Гэта своячасовая падрыхтоўка ў нас сарвана, ня гледзячы на дырэктывы партыі і ўраду, ня гледзячы на тое, што «Зьвязда» ўвесь час сыгналізавала аб прарывах на гэтым важнейшым участку работы.

Бюро ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове па гэтым пытаньні характарызуе становішча падрыхтоўкі да навучальнага году, як сур'ёзнейшую пагрозу своячасоваму пачатку заняткаў, а гэта азначае пагрозу зрыву плянаў падрыхтоўкі кадраў.

У чым прычына гэтага зрыву? Чаму і дагэтуль нашы навучальныя ўстановы не забясьпечаны кіраўнічымі і настаўніцкімі кадрамі, адпаведным кантынгентам студэнцтва, не забясьпечаны навучальнай і жыльлёвай плошчай, харчаваньнем?

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б, якую мы сёньня друкуем, выразна гаворыць пра тое, што гэты прарыў у падрыхтоўцы да навучальнага году **«зьяўляецца галоўным чынам вынікам недаацэнкі задач па падрыхтоўцы кадраў, як з боку цэнтральных зацікаўленых устаноў, так і адпаведных выканкомаў і саветаў».**

Факты, якія зьмяшчаліся ў «Зьвязьдзе», пра якія гаварылі на шматлікіх нарадах, пра якія гавораць і зараз лісты рабселькораў—яскрава сьцьвярджаюць гэтую ацэнку бюро ЦК.

Камсамол нічога не зрабіў, каб выканаць заданьне партыі па мабілізацыі камсамольцаў у пэдагагічныя навучальныя ўстановы. Так камсамольская арганізацыя Меншчыны прыслала па мабілізацыі 1.500 у польпэдтэхнікум усяго 2 чал., у Белпэдтэхнікум—14, а на пэдкурсы—0. Фрунзаўскі РК камсамолу ня выканаў заданьня РК КП(б)Б аб пасылцы 200 у пэдустановы і дагэтуль ня прыслаў туды ні аднаго камсамольца. У Слуцку камсамол ня толькі ня выканаў разьвёрсткі па мабілізацыі, але нават забраў з слуцкага Белпэдтэхнікуму 8 камсамольцаў у гомельскі тэхнікум шляхоў зносін і аднаго ў ленінградзкі кінотэхнікум.

Прафсаюзы ў сваёй штодзённай рабоце не зварачалі ўвагі на справу падрыхтоўкі кадраў. У выніку, у нашых навучальных установах вялікі недабор рабочых.

Большасьць акругкомаў і райкомаў партыі ня выканалі дырэктывы ЦК КП(б)Б аб падрыхтоўцы да навучальнага году.

Бюро ЦК канстатавала, што і **культпроп ЦК на справу кіраўніцтва разгортваньнем новага навучальнага году зьвярнуў мала ўвагі** і да апошняга часу ня прыняў ніякіх мер да сыгналізацыі перад бюро ЦК КП(б)Б аб сапраўдным становішчы падрыхтоўкі да навучальнага году.

Наркамасьветы, ВСНГ, Наркамзем, гаспадарчыя арганізацыі зусім слаба выконвалі дырэктыву партыі аб падрыхтоўцы да навучальнага году.

Аб чым сьведчыць хоць-бы той факт, што і да гэтага часу ў навучальных установах, якія зноў адкрываюцца, няма навучальных плянаў, навучальных праграм? Аб чым, як не аб агіднейшай недаацэнцы справы пад рыхтоўкі кадраў гаворыць той факт, што і да гэтага часу прэзыдыум ВСНГБ нават не заслухоўваў пытаньня аб кадрах, аб падрыхтоўцы да навучальнага году. Ён толькі выказаў загады і часта першы гэтыя загады ня выконваў.

Пастанова ЦК КП(б)Б і Саўнаркому ад 21-га ліпеня г. г. аб водпуску 750 тыс. руб. на будаўніцтва ФЗВ ня выканана. Гэтыя сродкі на мясцох не скарыстоўваюцца.

Белдзяржбуд ня толькі ня выконвае пастанову Саўнаркому аб першачарговасьці школьнага будаўніцтва, але робіць наадварот. Так здарылася з будаўніцтвам с.-г. акадэміі, дзе замест таго, каб накіраваць туды рабочую сілу і матар'ял—былі вывезены адтуль ў Віцебск паўтары вагоны жалеза, скарацілі штат рабочых, звольнілі 30 каменшчыкаў.

Белкаапсаюз замест таго, каб выканаць дырэктыву Саўнаркому аб забясьпячэньні харчаваньнем студэнцтва —спасылаючыся на аб'ектыўныя прычыны, на «іншых вінаватых», нават і цяпер не пацікавіўся колькасьцю набору студэнтаў у навучальныя установы Менску, ужо не гаворачы пра іншыя месцы.

Аб чым, як не аб злачынным зрыве пастаноў партыі і ўраду—гаворыць той факт, што БДВ ня выканала нават і дзесятай долі заданьня па своячасовым плянавым выданьні падручнікаў.

Усе гэтыя факты гавораць аб самай яўнай недаацэнцы задач падрыхтоўкі кадраў з боку раду ўстаноў і арганізацый. Па гэтай недаацэнцы трэба біць і біць з усёй рашучасьцю і бязьлітаснасьцю.

Мы ні ў якім разе не дапусьцім зрыву заняткаў, зрыву пляну падрыхтоўкі кадраў.

Мерапрыемствы, якія вызначыла бюро ЦК КП(б)Б па забясьпячэньні пачатку навучальнага году, павінны быць поўнасьцю выкананы.

Трэба раз назаўсёды запамятаць, што інгнараваньне дырэктыў партыі аб падрыхтоўцы кадраў—ёсьць праява апартунізму на практыцы, па якім партыя ўдарыць бязьлітасна.

АБ СІЛАСАВАНЬНІ

Засіласаваць 1 мільён тон да 1 кастрычніка

1. Ня гледзячы на тое, што сіласаваньне зьяўляецца важнейшым мерапрыемствам у справе вырашэньня жывёлагадоўчай праблемы,—плян сіласаваньня ў сучасны момант выкананы па БССР на 1,1 проц. з прычыны таго, што існуе фактычная недаацэнка важнасьці сіласаваньня. Асабліва недапушчальна тое, што саўгасы плятуцца ў хвасьце па выкананьні пляну сіласаваньня.

2. Зямельныя і калгасна-каапэрацыйныя органы, прафсаюзныя арганізацыі (асабліва саюз с.-г. і лясных рабочых і працасьветы), партыйныя і камсамольскія арганізацыі, большасьць цэнтральных і акруговых газэты не ўсьвядомілі важнасьці сіласнай кампаніі і па-сапраўднаму не ўзяліся за яе правядзеньне. Толькі гэтым можна тлумачыць становішча, якое стварылася ў справе сіласаваньня.

Засіласаваць адзін мільён тон можна пры ўмове, калі будзе ўсімі арганізацыямі ўсьвядомлена гаспадарча-палітычнае знач

Рыхтуйцеся да конкурсу на лепшае прадпрыемства

МІЛЬЁН РУБЛЁЎ У ПАДАРУНАК 3-му ГОДУ ПЯЦІГОДКІ

„ПРАЛЕТАРЫ“ ПАДВОДЗІЦЬ ВЫНІКІ „СУСТРЭЧНАМУ ПРАМФІНПЛЯНУ“

Лепшыя рабочыя ідуць у рады камуністычнай партыі

Новы прамфінплян— да варштату

Рабочыя Гомельскага заводу «Пралетары» адразу зразумелі, што «сустрэчны прамфінплян» толькі тады дасьць эфэкт, калі ён будзе даведзены да кожнага варштату, да кожнага рабочага. У гэтай рабоце заводзкія арганізацыі праявілі і гнуткасьць і хуткасьць: майстры цэху і эканомаддзелу выканалі гэтую работу на працягу аднаго тыдня.

Агульная праграма, даная трэстам— выпусьціць прадукцыі на 4.400.000 руб. павялічана «сустрэчным прамфінпляном» — да 5.400.000.

На плане трэсту прадукцыйнасьць працы павінна быць узьнята на 15%, па «сустрэчным» — на 19,5 проц.

Зьніжэньне сабекошту па плане трэсту — 11 проц, па «сустрэчным»— 13,5 проц.

Адкуль атрымаліся гэтыя лічбы? Дае гарантыя іх выкананьня? Хто за іх адказвае? Зараз убачым.

«Скваная брыгада» атрымала заданьне выпусьціць у гэтым годзе 780 растворамяшалак. Улічваючы ўсе магчымасьці, «скваная брыгада» бярэ на сябе абавязацельства выпусьціць 1080 растворамяшалак. «Скваская брыгада» —105 чалавек — адказвае за выпуск 1080 машын.

Ліцейшчыкі замест 1600 тон чыгуначнага ліцьця бяруцца выпусьціць 1830 тон, кацельшчыкі замест 40 паравых катлоў даюць 60.

„Сустрэчны“—лепшых ударнікаў

Трэба таксама ўказаць на асобных ударнікаў, якія высоўваюць «сустрэчны» прамфінплян у сваёй рабоце, на сваім варштаце.

М. Хаўкін — токар, мае 30 гадоў вытворчага стажу. Працуе на варштаце № 2, робіць барабаны для лябёдак. Атрымаў заданьне на 30 барабанаў у месяц, а па «сустрэчным прамфінпляне» бярэцца выпускаць 40.

Шустаў — 20 год вытворчага стажу. Токар, працуе на варштаце № 3, робіць валікі для барабанаў. Атрымаў заданьне на 30-31 год на 80 штук у месяц: «сустрэчны прамфінплян» Шустава — 100 валікаў.

Соркін — камсамолец працуе на варштаце № 19. Робіць ролікі для растворамяшалак. Яго заданьне 320 штук на 30-31 год, «сустрэчны прамфінплян» — 400 штук.

Тое-ж самае наглядаецца ў медна-ліцейным цэху.

Падольны — фармаўшчык, які робіць разэткі для арматуры па заданьні на 1930-31 год павінен даць 37 форм у дзень. «Сустрэчны прамфінплян» Падольнага — 40 штук.

Пеўцоў — фармаўшчык, выконвае тую-ж самую работу, што і Падольны. Ён таксама атрымаў заданьне — рабіць 37 форм. Яго «сустрэчны» — 42 формы.

На прыкладзе двох апошніх рабочых, якія робяць аднолькавую работу і атрымалі аднолькавае заданьне, мы ўпэўніваемся ў рэальнасьці выкананьня «сустрэчнага прамфінпляну». Пеўцоў фізычна мацней Падольнага і лепш прыстасаваўся да гэтай работы і таму ён высоўвае больш вялікі «сустрэчны прамфінплян», чымся Падольны. Абодвы ўлічылі ўсе свае магчымасьці і здольнасьці.

Адначасова з гэтым мы маем масавае добраахвотнае зьніжэньне расцэнак.

У арматурным цэху агульнае зьніжэньне расцэнак на ўсе работы складае 7 проц. Па чыгунначна-ліцейным — 6 проц., у абрубачным— 3 проц.

Рабочыя патрабуюць скарачэньня раду накладных выдаткаў шляхам зьмяншэньня колькасьці абслугоўваючага пэрсаналу. Ліцейшчыкі прапануюць, каб замест 8 чалавек абслугоўваючага і тэхнічнага пэрсаналу было 7 чалавек і з гэтай прапановай згодзен і майстар цэху.

Мы маем усе даныя, каб сказаць, што ўсе арганізацыі заводу працуюць зараз бальшавіцкімі тэмпамі. Паказалі сябе цэхавыя камітэты, якія праводзяць усю гэтую работу пад кіраўніцтвам агульнازаводзкага камітэту. Заводакіраўніцтва вывесіла загад аб прэм'яваньні лепшых па прапрацоўцы «сустрэчнага прамфінпляну»: лепшаму цэху—300 р., лепшай брыгадзе — 200 руб., лепшаму майстру —100 руб.

ТАВ. ЯРУМСКІ—майстра ліцейнага цэху заводу «Пралетары», лепш за ўсіх майстроў прапрацаваў з рабочымі «сустрэчны прамфінплян».

Прапановы рабочых—аснова „сустрэчнага прамфінпляну“

Прапановы рабочых зьяўляюцца асновай «сустрэчнага прамфінпляну». Ударнікі, якія высунулі «сустрэчны прамфінплян», далі рад каштоўных прапаноў, якія могуць з'эканоміць не адну тысячу рублёў. Многія прапановы цесна зьвязаны з павялічаным «сустрэчным прамфінплянам». Такіх прапаноў ёсьць звыш 100.

Трэба адзначыць цікавае мерапрыемства медна - ліцейнага цэху. Кожны рабочы, брыгада, якія ўнесьлі прапанову, атрымліваюць на рукі афіцыйную расьпіску ад майстра цэху наступнага зьместу:

АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВА

Імя і прозьвішча .....

Унёс прапанову .....

У чым яна выяўляецца .....

Тэрмін выкананьня .....

За дакладнае выкананьне гэтай прапановы і ў тэрмін адказваю

Майстар цэху (подпіс) .....

Гэты пачын — запазычаны ў рабочых Днепрапятроўскага заводу імя Дзяржынскага. Аб значэньні гэтага абавязацельства гаварыць ня прыходзіцца. Майстар цэху нясе маральную і нават судовую адказнасьць у выпадку невыкананьня абавязацельства. Маючы на руках такі дакумант, рабочы патрабуе няўхільнага выкананьня сваіх прапаноў у тэрмін.

Галоўнае—перамагчы вузкія месцы

Практыка прапрацоўкі прамфінпляну па заводзе «Пралетары» паказвае, што галоўную ўвагу трэба зьвярнуць на тыя цэхі, якія могуць стаць тормазам у выкананьні сустрэчнага прамфінпляну. Ва ўмовах мэталяапрацоўчай прамысловасьці такімі цэхамі зьяўляюцца ліцейныя.

Ліцейшчыкі заводу «Пралетары» пабальшавіцку зразумелі, якую ролю яны іграюць у «сустрэчным прамфінпляне». Яны мабілізавалі ўсе магчымасьці, яны ўнесьлі рад каштоўных прапаноў і ліцейны цэх з вузкага месца зрабіўся ініцыятарам «сустрэчнага прамфінпляну». Па ім раўняюцца ўсе іншыя цэхі. Пытаньне аб выпуску 90 растворамяшалак замест 65 у месяц пастаўлена ліцейным цэхам. «Сустрэчны прамфінплян» ліцейшчыкаў, які перавышае прамфінплян на 230 тон — лепшая гарантыя выкананьня абавязацельстваў па «сустрэчным прамфінпляне» ва ўсіх іншых цэхах.

Асабліва праявіла сябе «скваная брыгада» ліцейнага цэху.

Майстар цэху тав. Ярумскі будзе прэм'яваны, як лепшы майстар. Таксама будзе прэм'яваны старшыня цэхкамітэту тав. Хапфін.

У час прапрацоўкі «сустрэчнага прамфінпляну» ў старых рабочых чыгуна - ліцейнага цэху — **Вакводка, Гракаў, Фон, Сычоў, Стука, Волкаў, Іваноў, Кузін, Жмакін** падалі калектыўную заяву аб прыёме ў партыю.

Гэта лепшы дакумант, які кажа аб правільнай генэральнай лініі партыі.

Гэта — моцны ўдар па правых апартуністых, якія крычаць аб празьмерных тэмпах будаўніцтва. Гэта — лепшы довад таго, што рабочыя разам з партыяй перамогуць усе цяжкасьці, якія перад імі стаяць.

Б. ЗЭЛЬМАНАЎ.

Першыя вынікі збору макулатуры

За апошнія дні ў Беларускі Штаб паступілі весткі аб ходзе Месячніка збору папяровай макулатуры па БССР.

Па Менску за 20 дзён жніўня месяца паступіла 30.300 кгр. макулатуры, у той час, калі за ліпень месяц паступіла ўсяго 14.910 кгр. На гэтых днях БДВ здало вагон — 8 тон макулатуры. Цэнтр МОПР Бел. здае ўвесь свой стары архіў капэ 60кгр. у макулатуру. Рэдакцыя «Зьвязды» здае 960 кгр. старых газэт. Рабкоры заводу «Энергія» правялі паход па заводу, у выніку чаго сабралі больш 50 кгр. макулатуры.

Гэта толькі першыя вынікі па Менску. Яшчэ няма вестак аб ходзе Месячніка ад іншых раёнаў БССР.

З мэтай разгортваньня работы па правядзеньні Месячніка і арганізацыі сталага збору папяровага ўцілю, Беларускі Штаб камандыруе брыгадзіраў у Гомель, Рэчыцу, Калінкавічы, Мазыр, Віцебск, Полацак, Лепель, Магілеў, Воршу, Горкі, Клімавічы, Бабруйск, Слуцак і Капыль, куды сёньня гэтыя брыгадзіры выяжджаюць.

У Беларускі Штаб паступае шмат прапаноў ад работнікаў савецкіх устаноў, рабкораў і саматужнікаў аб мерапрыемствах па эканоміі паперы.

З мэтай правядзеньня першага масавага находу па горадзе Менску, які адбудзецца 10 верасьня, скліканна 30-га жніўня папыраная гарадзкая нарада сакратароў ячэек ЛКСМБ, важатых піянэратрадаў і старшынь фарпостаў.

Нажаль, у другі раз прыходзіцца адзначыць, што ганебна адстаюць прафсаюзы. За выключэньнем саюзу Друкароў і Саўтанальслужачых астатнія саюзы стаяць нічога ня робячы ў гэтай справе.

Няўжо-ж пытаньне аб эканоміі паперы і збору макулатуры да нашых прафсаюзаў не датычыцца. Няўжо-ж нашы прафсаюзы ня ведаюць, што без патрэбнай колькасьці паперы нельга будзе ўзьняць культурны ўздым прафсаюзнай масы.

ЦУДЗІН.

Штаб бязьдзейнічае, рабочыя прапановы без увагі

Арганізаваць штаб «У паход за паперу» на фабрыцы «Чырвоная Зорка» зусім не працуе. Ён абмежаваўся толькі складаньнем плянаў і прыняцьцем некаторых пастаноў. Штаб вызначаны для правядзеньня цэлы рад мерапрыемстваў: надёты па цэхі фабрыкі, на Установы м Чашнікі і цэлы рад інш. Але ўсё гэта засталося толькі на паперы. Штабістыя не адчуваюць адказнасьці за сваю работу. Брыгадамі ў цэхах ніхто не кіруе.

Дрэнна наладжаны збор рабочых прапаноў. З мая месяца паступіла ўсяго 83 прапановы, з якіх ажыцьцёўлены 17. Шмат каштоўных прапаноў і вынаходак рабочых праходзяць міма заводакіраўніцтва і прафарганізацыі, бо апошнія мала цікавяцца рабочымі прапановамі. Ня гледзячы на тое, што ёсьць цэлы рад прапаноў аб выдачы прэміі за вынаходкі і ўдасканаленьні на фабрыцы, рабочыя не прэміруюцца.

Прафарганізацыі, камсамол, «лёгкая кавалерыя» да справы «У паход за паперу» не прыцягнуты. Парткалектыў работай штаба не кіраваў. У выніку гэтага ўся вызначаная работа штабу правалілася.

22-га жніўня, у сувязі з прыездам прадстаўнікоў акруговага штабу, была скліканна нарада рабкораў, дзе рабочыя фабрыкі ўзялі пад агонь самакрытыкі непрацаздольнасьць штабу. Нарада ўхваліла правесьці цэхавыя сходы рабочых па пытаньні «У паход за паперу», ажывіць работу брыгад цэхаў, прыступіць да практычнага выкананьня складзеных плянаў, вывесьці са складу непрацаздольных штабістых і замест іх абраць лепшых ударнікаў з вытворчасьці.

Мін. САБЕЦКІ.

БАБРУЙСКІ КАМБІНАТ АДКАЗВАЕ СТАЛІНЦАМ

БУДЗЕМ УПАРТА ЗМАГАЦЦА ЗА СЬЦЯГ ЦК КП(б)Б

КАНТРОЛЬНЫЯ ЛІЧБЫ ПАВЯЛІЧАНЫ ПА УСІХ ЦЭХАХ

Абгаварыўшы на агульных сходах рабочых і інжынэрна - тэхнічнага пэрсаналу ліст перадавога атраду пралетарыяту СССР — рабочых заводу імя Сталіна — аб арганізацыі ўсесаюзнага конкурсу спаборніцтва на лепшае прадпрыемства і адозву сакратара ЦК КП(б)Б тав. Васілевіча да рабочых і калгасьнікаў БССР аб падтрыманьні ініцыятывы сталінцаў — мы, рабочыя і інжынэрна - тэхнічныя работнікі Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату, ў піку 3.000 чал., вітаем новую ініцыятыву ленінградзкіх рабочых імя Сталіна і ўключаемся ў вытворча - гаспадарчы конкурс.

Ініцыятыва сталінцаў мае бязумоўна вялізарнае палітычнае значэньне ў мэтах практычнага ажыцьцяўленьня пастаноў XVI зьезду УсесКП(б) аб выкананьні пяцігодкі за чатыры гады. Конкурс лепшых прадпрыемстваў узмацніць барацьбу за новыя перамогі на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, падцягне і арганізуе адстаючыя прадпрыемствы.

Наш камбінат ня скончыўшы яшчэ і цяпер свайто будаўніцтва, толькі ў гэтым годзе пачаў сваю работу Яго пабудова зьяўляецца магутным укладам у наша сацбудаўніцтва, падкрэсьлівае правільнасьць генэральнай лініі партыі ва ўзятых цьвёрдых тэмпах на індустрыялізацыю краіны, зьяўляецца лепшым адказам усім ныцікам і малаверам з лягеру правых.

Уключыўшыся ў гэтым годзе ў рады змагароў за сацыялізм, за прамфінплян, нам ня раз прыходзілася пераглядаць свой прамфінплян у бок яго павялічэньня на грунце выяўленьня новых магчымасьцяй на камбінаце.

Першапачатковая праграма на 1929-1930 год прадугледжвала выпуск прадукцыі: па лесцэху 109.540 к. м. па фанцэху 16.000 к. м. Праграма намі пафанцэху 16.000 к. м. Праграма намі пафанцэху 16.000 к. м. **Праграма намі пафанцэху 16.000 к. м. Праграма намі пафанцэху 16.000 к. м. Праграма намі пафанцэху 16.000 к. м.

СПРАВАЗДАЧА аб ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОЗЕ

„ПАРОСТАК САЦЫЯЛІЗМУ“ НА ПРАВЕРЦЫ МАС

Сёнешні адзінаасобнік агітуе за калгас

Калгас „Паростак сацыялізму“ робіць справаздачы перад заўтрашнімі калгасьнікамі. „Заўтра першым уступаю ў калгас. Напэўна і ўся вёска ўступіць“. Новы калгас імя Варашылава—вынік бальшавіцкай справаздачы.

НОВАМУ ГОДУ—СУСТРЭЧНЫ КАЛГАСНЫ ПЛЯН. КАЛГАС „ПАРОСТАК САЦЫЯЛІЗМУ“ ПЕРШЫМ У БССР АБМЕРКАВАЎ СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН. НЯ 80, а 115, НЕ 50, А 150. КАЛГАСЫ БССР, „ПАРОСТАК САЦЫЯЛІЗМУ“ ВЫКЛІКАЕ ВАС АРГАНІЗАВАЦЬ СВОЙ СУСТРЭЧНЫ ПРАМФІНПЛЯН.

„Дзіўная справа. Ваш ураджай у два разы больш нашага“. Учарайшыя адзінаасобнікі, сёнешнія калгасьнікі Ратнікаў, Юдэнка, Сівакоў клічуць тых, хто не ў калгасе:

— Мы ўчора прышлі ў калгас, а сёньня запрашаем вас—пойдзем разам будаваць!

На беразе Дняпра ў 30-ці кілёмэтрах ад Рэчыцы вырас калгас «Паростак Сацыялізму». У мінулым на месцы калгасу быў панскі маёнтак. Уладаньні абшарніка Філончыкава, які шалёна зьдзекваўся над ваколічнай беднатой. Цяпер тут—калектыўная гаспадарка, народжаная ў суровым змаганьні з кулацтвам, малады сацыялістычны паростак, які руйнуе межы індывідуальных палосак.

Калгас расьце і мацнее. За адзін год рады калгасьнікаў вырасьлі ў некалькі раз. Першую калектыўную сяўбу калгасьнікі арцелі «Паростак Сацыялізму» правялі па-бальшавіцку. Па-бальшавіцку засеялі, пабальшавіцку і ўбралі. Уборачная кампанія ў калгасе прайшла з вялікім уздымам.

Цяпер ідзе будоўля. Будуюцца дамы, хлявы, сьвінарнікі. Вырасьлі сьцены новага школьнага будынку, пабудаваны жыльлёвыя памяшканьні для батракоў-калгасьнікаў. Калгас «Паростак Сацыялізму» ўжо цяпер, калі ён толькі пачынае моцна станавіцца на ногі, зьяўляецца магутным агітатарам за калектывізацыю ў раёне. Да яго цягнуцца адзінаасобныя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі.

Кулакі ня раз спрабавалі разбурыць калгас шалёнай атакай правакацыйнай хлусьні і паклёпаў. Кулакі спрабавалі пасварыць калгасьнікаў і адзінаасобнікаў, атруціць калгас атрутай спрэчак і склок. Усе спробы клясавага ворага скончыліся поўнай няўдачай. Расьце аўтарытэт калгасу ў вачох падалескіх адзінаасобнікаў. Усё новыя і новыя адзінаасобныя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі ўступаюць у «Паростак Сацыялізму».

Зараз калгас «Паростак Сацыялізму» выйшаў **на праверку мас.** Ён робіць справаздачы перад адзінаасобнікамі аб сваім жыцьці і змаганьні, аб сваіх посьпехах і недахопах у будаўніцтве калектыўнае гаспадаркі. Гэтымі днямі калгас зрабіў справаздачу перад адзінаасобнікамі **Падалескага і Азэршчынскага** сельсаветаў.

ПРАВЕРКА ПАЧАЛАСЯ

Ня гледзячы на дрэннае надвор'е, на дождж, якім бесьперапынна частавалі хмары пёску Падалесьсе, на справаздачу калгасу прыйшлі ўсе. Усё Падалесьсе прыйшло паслухаць, што ім скажа калгас пра свае работу, дасягненьні, пра радасьці першай бальшавіцкай вясны, пра вынікі першага калгаснага ўраджаю.

Памяшканьне, дзе адбываўся сход, было перапоўнена. Перад пачаткам сходу ішлі доўгія і гарачыя размовы. Падалесьны акружылі старшыню Рэчыцкага райвыканкому дваццаціпяцітысячніка т. Абрамовіча. Пасьпаліся шматлікія запытаньні аб хлебазагатоўках, ліквідацыі акруг, аб міжнародным і ўнутраным падзеях, аб усіх гаспадарча-палітычных кампаніях.

Нарэшце, нехта з кутка заўважыў—час пачынаць, хутчэй адкрывайце сход. Гутарка тав. Абрамовіча а адзінаасобнікамі і калгасьнікамі зьмянілася дзелавым сходам.

Сход адкрыўся. Пра работу калгасаў пачаў гаварыць старшыня арцелі «Паростак Сацыялізму» тав. **Чырык.**

— Мы прышлі да вас са справаздачай не для таго, каб сябе хваліць. Мы, калгасьнікі, просім сваіх суседзей, адзінаасобнікаў—беднякоў і сераднякоў паказаць на недахопы калгасу, дапамагчы нам выправіць нашы памылкі.

— Наша задача замацаваць дружбу з заўтрашнім калгасьнікам. Мы прышлі да вас і заяўляем, што **сустрэнем вас у сябе ў калгасе ў любы час дня і ночы.**

„НАШ УРАДЖАЙ У ДВА РАЗЫ БОЛЬШЫ“

Далей тав. Чырык гаварыў пра разьмеркаваньне ўраджаю ў калгасе. Адзінаасобнікі слухалі справаздачу аб вялікай перамозе.

— Ураджай у калгасе,—кажа тав. Чырык,—амаль па ўсіх культурах **у два разы больш за Ваш ураджай. Наш ураджай з аднаго гэктара жыта ў сярэднім дае 12,7 цэнтнэраў, а ў Вас—5,6 цэнтнэраў. Калгасны гэктар даў нам 164 цэнтнэры бульбы, а ў Вас, на Вашых адзінаасобных палосках адзін га бульбы дае 80-95 цэнтн. Наш гэктар пад ячменем дае 6 цэнтн., а ў Вас ячмень амаль зусім загінуў. З аднаго гэктара яравой пшаніцы мы атрымалі 7 цэнт., а Ваша пшаніца з аднаго га дае ў самым лепшым выпадку 4 цэнтнэры.**

— Тое-ж мы бачым і з агароднінай. Ураджай нашых агародных культур больш за Вашага ўраджаю таксама ў два разы. Толькі пад адзін прамысловы агарод калгас засеяў больш 16 гэктараў. Ад агароду мы атрымаем 17.000 руб. Апроч таго, кожны калгасьнік мае агарод для сябе ў індывідуальным карыстаньні.

— 188 гэктараў прысаду, якія мае наш калгас, далі нам 33.556 руб. прыбытку.

Дзе прычыны такога ўраджаю? Чаму калгасныя палі атрымалі такую бліскучую, пячуваную перамогу над індывідуальнымі палоскамі, над адзінаасобнай гаспадаркай? Тав. Чырык растлумачвае адзінаасобнікам гэтыя прычыны:

— У калгасе была лепшая і своячасовая апрацоўка зямлі. Мы амаладзілі нашы палі рознымі ўгнаеньнямі. Наш калгас ўжыў некалькі дзесяткаў тон мінэральных угнаеньняў і засеяў гатункавым насеньнем.

— Мы правялі радковы пасеў, сяўбу па цаліне, устанавілі правільны севазварот у калгасе і г. д.

67.000--15.000

— Наш валавы даход складае звыш 67.000 рублёў. Сюды ўваходзяць прыбыткі ад паляводства, садоўніцтва, агароднічства, жывёлагадоўлі, лугаводзтва і інш.

— 2.514 руб мы разьмяркоўваем сярод калгасьнікаў адпаведна кошту маемасьці абагуленай імі. Гэта сума складае 5 проц. валавога ўраджаю і прыбытку ад абагуленай малочна-прадукцыйнай жывёлы. 22.055 руб. мы адлічаем у насеньні і фуражны фонды на пакрыцьцё крэдытаў страхоўкі і г. д.

Після гэтых адлічэньняў умоўна чысты прыбытак нашага калгасу складае 42.519 руб. 10 проц. гэтае сумы мы адлічылі ў непадзельны капітал, 2 проц.—у культурна-бытавы фонд, 3 проц. на ўтрыманьне непрацаздольных і 1 проц. на прэміяваньне лепшых калгасьнікаў і дапамогу школьнікам—дзецям членаў калгасу.

— Прыбытак членаў нашага калгасу «Паростак Сацыялізму» ў некалькі раз большы за Ваш прыбытак. Раней, да аб'яднаньня ў калгас, нашы гаспадаркі давалі ўсе разам 15-17 тысяч рублёў прыбытку. А зараз гэтыя-ж гаспадаркі, аб'яднаныя ў калгас, далі прыбытак, які дасягае 67.000 рублёў.

— Калгас не сабез,—гаварыў далей тав. Чырык. Перадавыя калгасьнікі, якія паказалі ўзор прадоўнай дысцыпліны і добрасумленнай работы, атрымліваюць больш за тых, якія неахайна адносіліся да работы. **Мы разьмяркоўваем свой ураджай толькі па колькасьці і якасьці працы.**

Тав. Чырык доўга яшчэ расказваў падалескім адзінаасобнікам, якія лавілі кожнае яго слова аб разьмеркаваньні ўраджаю, пра тое, што прыбыткі членаў калгасу «Паростак Сацыялізму» ў 3-4 разы большыя за прыбыткі адзінаасобнікаў.

„ІДЗЕЦЕ ДА НАС, БУДУЙЦЕ КАЛЕКТЫЎНУЮ ГАСПАДАРКУ“...

— Цяпер вы, навочна ўбачыўшы нашы дасягненьні,—канчаў свой даклад т. Чырык,—можаце перакананца ў перавагах калектыўнай працы над індывідуальнай. Шмат хто з вас ужо пераканаўся: пасьля веснавой сяўбы, якую мы правялі пабальшавіцку і да тэрміну, з посьпехам перавыканалі наш пасеўны плян, у нашу калгасную сям'ю ўлілося 35 адзінаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. А ў дні разьмеркаваньня ўраджаю, калі беднякі і сераднякі адзінаасобнікі пераканаліся, што **чуткі аб пайках зьяўляюцца хлусьнёй,** контрэвалюцыйным паклёпам клясавага ворага-кулака, калі адзінаасобнікі ўпэўніліся, што мы ня садзем на паёк, а разьмяркоўваем свой ураджай па колькасьці і якасьці працы, затрачанай кожным калгасьнікам, да нас перайшло 12 новых адзінаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. І цяпер **КОЖНЫ ДЗЕНЬ У КАЛГАС ПАСТУПАЕ ПА НЕКАЛЬКІ ЗАЯЎ. Мы не зачыняем дзьвярэй для ўступленьня ў калгас. Наадварот, мы шырока расчыняем дзьверы калгасу і клічам беднату і сераднякоў.**

— Арганізуйцеся, ідзеце да нас, мы вам дапаможам, будуйце калектыўную гаспадарку.

Пачалася сяўба. Перад выхадам у поле

Даклад скончыўся. Задаюцца пытаньні. Адзінаасобнікі цікавяцца, які падатак плоціць калгас, як працуе праўленьне калгасу і г. д. Потым разгарнуліся **спрэчкі, якіх, бадай, ня бачыў яшчэ ні адзін іншы сход.** Сёнешнія адзінаасобнікі—заўтрашнія калгасьнікі, падалескія беднякі і сераднякі выступалі і давалі ацэнку калгасу.

Самакрытыка мас была суровай. Адзінаасобнік гаварыў пра факты, пра тое, што ён бачыў сваімі вачыма. Першым слова атрымаў тав. **Ісадчэнка** Мікіта, адзінаасобнік—маламоцны серадняк.

„БРАТКІ, ПРЫМЕЦЕ У КАЛГАС...“

— Калгасьнікі дабіліся вялікіх посьпехаў,—сказаў ён. І гэта таму, што яны пакончылі а межамі. Жыў ў нас ураджай? Зусім дрэнны. У нас адны толькі межы займаюць 1/6 частку зямлі. Свой ураджай, а які ўбор. Калгасны ўраджай у два разы больш за наш, прыбыткі калгасьнікаў у тры разы вышэй нашых.

— Трэба [illegible] угаварыць жонку ісьці ў калгас. Хутчэй угаварыць,—канчае Ісадчэнка.

[illegible] Адам Шабан.

— Мая сям'я складаецца з 4-х чалавек. Усе працаздольныя і працуем кожны дзень. А якая карысьць з гэтай работы? Увесь прыбытак маёй гаспадаркі будзе ня больш 650 руб. І выходзіць, што **ўдава калгасьніца Дубавец Праскоўя мае ў два разы больш даходу, чым я.** Дубавец пры разьмеркаваньні ўраджаю і прыбыткаў у калгасе атрымала 1.335 руб., а я са сваёй адзінаасобнай гаспадаркі атрымаю толькі 650. Якая розьніца! Мая-ж сям'я працавала ня менш за Праскоўю, а нават значна больш.

Гаварыў 70-гадовы стары Цыбук Навум:

— Мы ўсе бачым цяпер, што ў калгасе жыць лепш і лягчэй. «Як жылі дзяды—так павінны жыць і мы»,—цяпер гэтыя словы да нас не падыходзяць.

Стары Цыбук тут-жа на сходзе просіць калгасьнікаў прыняць яго ў сваю сям'ю:

— Браткі, прымеце мяне ў калгас.

Усю ноч ішлі бурныя, гарачыя, дзіўныя спрэчкі. Тав. **Баранаў Сазон,** адзінаасобнік, цьвёрда парашыў **заўтра-ж уступіць** у калгас.—Даем тав. Баранаву слова,—абвяшчае старшыня сходу.

І МЯНЕ

— З самай вясны, пасьля таго, як у нашым раёне пры правядзеньні калектывізацыі былі дапушчаны грубыя памылкі, нас адзінаасобнікаў ніхто ня зьбіраў на сходы. Нам ніхто нічога не гаварыў пра калгасы, пра тое, як будзе разьмяркоўвацца калгасны ўраджай. Ведалі-б мы, што ўраджай у калгасах будзе разьмяркоўвацца па колькасьці і якасьці працы, дык у арцелі «Паростак Сацыялізму» было-б значна больш членаў. Вельмі добра робіце, што вылучаеце 5 проц. на абагуленую маемасьць. Зьнішчаць жывёлу, разбазарваць насеньне больш ня будуць і тыя асобныя калгасьнікі, якія дзе-ні-дзе гэта робяць.

— Пры правядзеньні калектывізацыі нас, адзінаасобнікаў, палохалі ссылкай, тым, што ўсе нашы хаты будуць казённымі. Вось чаму мы ня ішлі ў калгасы, чаму мы баяліся калектывізацыі. А цяпер, калі мы ўбачылі як жыве калгас «Паростак Сацыялізму», калі вы нам сёньня падрабязна расказалі пра калектыўную гаспадарку, дык я ўпэўнены, што ўся вёска ўступіць у калгас. **Ня сёньня—заўтра ўсё наша Падалесьсе будзе ў калгасе.**

— Раней ня было калгасу і ўсе мы аралі тую зямлю, якую займае цяпер «Паростак Сацыялізму», а ўсёроўна хлеба да новага ўраджаю зусім не хапала. Цяпер-жа калгас адных толькі лішкаў, як сказаў тав. старшыня, здае 200 цэнт. Дзіўная справа!

Потым, у сваім выступленьні тав. Баранаў горача дзякаваў калгасьнікам за аказаную яму дапамогу, як выдача грэчкі і яўса на сяўбу, дзякаваў за тое, што **калгас дае свае машыны адзінаасобнікам для абмалоту ўраджаю і сявяркі для пасеву азімых.**

— Заўтра першым уступаю ў калгас. Напэўна і вёска ўся ўступіць.

РАЗАМ БУДАВАЦЬ НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ

— У мяне,—гаворыць серадняк **Кастусь Каршак,**—пры двух працаздольных на 6 чалавек сям'і будзе прыбыткаў ня больш 250 рублёў. Калгасьнік-жа **Сівуха** Лявон з такой-жа колькасьцю працаздольных атрымаў у калгасе 714 руб. прыбытку. Цяпер мы бачым, што ў калгасе жыць лепш.

Выступаў тав. **Кавалёў** Макар, арганізатар калгасу. Гэта ён, пасьля дэмабілізацыі з Чырвонай арміі, энэргічна ўзяўся за арганізацыю калгасу ў сваёй вёсцы. Разьюшаныя кулакі награжалі тав. Кавалёву забойствам, аднак ён не адступае і, з дапамогаю батрацка-бядняцкага актыву, арганізуе калгас. Сярод калгасьнікаў арцелі «Паростак Сацыялізму» тав. Кавалёў карыстаецца шанаваньнем і аўтарытэтам. Да яго голасу прыслухоўваюцца і адзінаасобнікі.

— Бацька мой,—гаворыць тав. Кавалёў,—адзінаасобнік-серадняк, мае 7 гэкт. зямлі, пару коняй, дзьве каровы і інш. У гэтым годзе мой бацька мае ўсяго 600 руб. са сваёй серадняцкай гаспадаркі, а я з жонкай у калгасе 730 руб. У калгас-жа я прышоў літаральна з голымі рукамі. Цяпер і мой бацька, які раней быў супроць калектывізацыі, думае ўступіць у калгас.

— Падкулачнікі і асобныя адсталыя адзінаасобнікі, калі мы толькі прыступілі да арганізацыі калгасу, сьмяяліся над намі:

— Гадаваць будзеце, на паёк вас пасодзяць,—хлусілі ворагі калектывізацыі.

Цяпер кожны з прысутных тут батракоў, беднякоў і сераднякоў—адзінаасобнікаў можа пераканацца ў перавагах калектыўнае працы. Мы запрашаем Вас:

— Пойдзем клясавых ворагаў, ідзеце разам з намі будаваць калектыўную гаспадарку, паноўна будаваць **сваё жыцьцё.**

Выступленьне серадняка **Кавалёва** прадстаўляла сабой скандэсаваны згустак настрояў усіх прысутных. Ён павольна, нібы шкадуючы словы, сказаў:

— Партыя права. Мы—заўтрашнія калгасьнікі. Усей вёскай хочам у калгас.

ГАВОРАЦЬ УЧАРАЙШЫЯ АДЗІНААСОБНІКІ

Выступалі і **учарайшыя** адзінаасобнікі. Напрыклад, тав. **Юдэнка** Ігнат, бядняк, які разам са сваімі братамі беднякамі Рыгорам і Язэпам уступілі ў калгас у апошнія дні, у тыя дні, калі калгасьнікі разьмяркоўвалі вынікі сваёй калектыўнай работы.

Юдэнка гаварыў пра тое, што калгас «Паростак Сацыялізму» дабіўся вялікіх посьпехаў, што «калгасьнікі маюць у 4 разы больш прыбытак, чым мы, учарайшыя адзінаасобнікі».

— Мы добра ведаем куды вядзе нас камуністычная партыя, — працягваў Юдэнка. Мы ўчора прыйшлі ў калгас, а сёньня вас запрашаем:

— Пойдзем будаваць разам!

І так выступала шмат каго з учарайшых адзінаасобнікаў, якія толькі ў апошні час сталі калгасьнікамі. І Ратнікаў, і Сівакоў Андрэй, і Кузьнец, і Сыравешка Масей, якія зусім нядаўна ўступілі ў калгас, гаварылі пра тое, чаму яны так зрабілі. Іх выступленьні цалкам былі аналёгічнымі прамове тав. Юдэнка.

Учарайшыя адзінаасобнікі адзначалі **палітычную блізарукасьць асобных камуністых калгасьнікаў, якія на сходзе пры разьмеркаваньні ўраджаю выступалі за зьмяншэньне 5 проц. адлічэньня ў фонд на абагуленую маемасьць тым сераднякам,** якія нядаўна ўступілі ў калгас. З гэтае прычыны з сераднякі, падаўшыя заявы аб уступленьні ў калгас, забралі іх назад.

Аб гэтай-жа блізарукасьці гаварыў і серадняк, стары калгасьнік тав. **Сідаранка,** ён-жа старшы садавод.

Сідаранка рашуча выступіў супроць прапановы сакратара ячэйкі КП(б)Б т. Мацюшэнка, які гаварыў, што калгасьнікаў трэба падзяляць на старых і новых. Старым усё, а новым нічога. Так выходзіла паводле Мацюшэнкавай прапановы.

У гэтым і заключаецца прычына, што частка сераднякоў ня ўступіла ў калгас. Яна дала [illegible] кулакам.

кулакам у іх агітацыі супроць калгасу.

Трэба проста сказаць, што асобныя партыйцы-калгасьнікі дапусьцілі грубейшыя антысерадняцкія памылкі. Вось, напрыклад, член партыі **Бабок** выступаў ня толькі супроць 5 проц. адлічэньня (цяпер ён прызнаў сваю грубую памылку), але і агітаваў калгасьнікаў, каб не **дапускаць сераднякоў да кіраўніцтва калгасам.**

Бабок гаварыў:—«Садавод-серадняк, сьвінавод таксама серадняк, брыгадзір на полі—серадняк. А дзе-ж наша беднята? Пара ўжо адпыць сераднякоў».

Гэта дэмагагічная, антыпартыйная агітацыя толькі ліла ваду на млын кулацтва, якое шалёна змагаецца за тое, каб не дапусьціць сераднякоў у калгасы. Пад кіраўніцтвам партыйнай ячэйкі калгас правільна разьмяркаваў ураджай.

***

Сход ухваліў рэзалюцыю кароткую і зразумелую, бяз усякіх лішніх слоў.

Сход адзначыў вялікія дасягненьні калгасу «Паростак Сацыялізму». А ў канцы рэзалюцыі адзінаасобнікі папрасілі калгас «яшчэ больш умацоўваць з намі дружбу і сувязь».

Позьняй ноччу, перад самай раніцай, сход закончыўся. **А НЕЎЗАБАВЕ, ПАД УПЛЫВАМ ПОСЬПЕХАЎ КАЛГАСУ «ПАРОСТАК САЦЫЯЛІЗМУ», У АЗЭРШЧЫНСКІМ СЕЛЬСАВЕЦЕ АРГАНІЗАВАЎСЯ НОВЫ КАЛГАС ІМЯ ВАРАШЫЛАВА.**

„СУСТРЭЧНЫ ПРАМФІНПЛЯН“ КАЛГАСУ

Цяпер калгас зноў узяўся за сваю штодзенную работу. У калгасьнікаў шмат клопатаў. Трэба абмалаціць новы ўраджай, прыступіць да сяўбы, скончыць будаўніцтва. А ўсякая работа патрабуе пляну. І таму **актыў арцелі «Паростак Сацыялізму» горача падхапіў ідэю арганізацыі сустрэчнага калгаснага пляну.** Гэтымі днямі праўленьне калгасу, разам з актывам, шырока абмеркавала пытаньне аб арганізацыі «сустрэчнага пляну» ў калгасе. **У арцелі «Паростак Сацыялізму» ствараюцца 4 плянавыя групы:**

1) Плянавая група па правядзеньні будаўніцтва ў калгасе.

2) Плянавая група па пашырэньні і



Трактарная калёна выяжджае на палі адзінаасобнікаў

папяпшэньні садоўніцтва і агароднічтва.

3) Жывёлагадоўчая плянавая група і 4) Гаспадарча-фінансавая група.

Новаму гаспадарчаму году калгасьнікі рыхтуюць сустрэчны калгасны плян. Плянавікі ўзяліся за работу. **Пасеўную плошчу аёймых калгасьнікі павялічваюць з 80 гэкт. да 115. Замест 50 сьвіньней, паводле першага пляну, калгасьніні парашылі паставіць ня менш 150 сьвіньней. Вызначана будаўніцтва 3-х новых жыльлёвых дамоў, пабудова якіх першым плянам не прадугледжвалася.**

***

Калгас «Паростак Сацыялізму» цьвёрдым крокам ідзе ў першых калёнах змагароў за сацыялістычную перабудову вёскі. Малады паростак ператварыўся ў моцную калектыўную гаспадарку. У сваёй барацьбе з кулакам, за адзінаасобніка—заўтрашняга калгасьніка, калгас «Паростак Сацыялізму» перамагае. Ён пераможа.

Е. САЛДАЦЕНКА.

Рэчыца,
жнівень 1930 г.
Брыгада «Зьвязды».

ХЛЕБАЗАГАТОЎКІ

НАД НАМІ НЯ КАПАЕ,--

апраўдваюць апартуністыя сваю бязьдзейнасьць

Памятайце, што плян хлебазагатовак за два месяцы выканан толькі на 23,6 проц.

Кожны ўпушчаны дзень--удар па выкананьні загатоўчых плянаў

Кампанія фактычна не распачата

(Гутарка з наркамгандлю БССР т. АБРАМСОНАМ)

Даныя аб ходзе хлебазагатовак на 25-га жніўня сьведчаць аб тым, што плян хлебазагатовак па БССР за ліпень і жнівень месяцы сарваны. За гэтыя два месяцы па БССР павінна было быць загатоўлена 4.920 тон збожжавых культур, а на сёнешні дзень загатоўлена 1.074 тоны ці 23,6 проц.

Сур'ёзнасьць становішча ня толькі ў тым, што хлебазагатоўкі праходзяць дрэнна, але і ў тым, што 50 раёнаў з 100 ня далі ніякіх вестак аб тым, як праходзяць у іх загатоўкі. У выніку, немагчыма кіраўніцтва цэнтральных устаноў, немагчыма своячасовае рэагаваньне на асобныя недахопы кампаніі.

Такое становішча сьведчыць аб тым, што хлебазагатоўчая кампанія па БССР амаль зусім яшчэ не разгарнулася.

Усё яшчэ ня зьнішчаны настроі і разважаньні аб тым, што хлебазагатоўкі па БССР пачнуцца пазьней і таму, моў, сьпяшацца няма чаго.

Адрывачныя весткі, якія атрыманы ад асобных раёнаў, гаворадь пра вельмі дрэнны ход хлебазагатовак.

Да гэтага часу ўсё яшчэ ня выкананы дырэктывы ЦК і ўраду аб давадзеньні плянаў да сяла і асобнага калгасу (Віцебскі, Жлобінскі, Гарадоцкі і шмат іншых раёнаў). **Но разгорнута работа па правядзеньні агульных сходаў на сяло для прыняцьця сельскіх плянаў.**

Злачынна адцягваецца выяўленьне і дача цьвёрдых заданьняў кулацка-заможным гаспадаркам. Сельсаветы вельмі нерашучя вызначаюць кулацкія гаспадаркі, якім павінны быць прад'яўлены цьвёрдыя заданьні. Яны просяць санкцыі раёнаў наконт кожнай выяўленай кулацкай гаспадаркі, замест таго, каб кіравацца пастановамі батрацка-бядняцка-серадняцкай часткі вёскі аб тым, каму даваць цьвёрдыя заданьні.

Калгасы ўжо пачалі здаваць хлеб, але гэта здача праходзіць вельмі марудна. Сярод калгасьнікаў нявыстарчальна разгорнута работа па своячасовым абмалоце і здачы хлеба дзяржаве. Ёсьць факты, калі калгасы пакідаюць першы абмалот для сваіх патрэб на цэлы год, а потым толькі зьбіраюцца здаць хлеб дзяржаве.

Асобныя калгасьнікі ня прыдягнуты да абгаварэньня пляну здачы хлеба і ў некаторых калгасах работа па здачы праходзіць у адміністрацыйным парадку. **Калгасьнік ня стаў яшчэ арганізатарам здачы хлеба індывідуальнымі бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі.** Калгасы ўсё яшчэ не зварачаюць належную ўвагу на якасьць хлеба, які здаецца. Ёсьць рад фактаў (Заслаўскі раён і інш.), калі калгасы здаюць вільготнае жыта. Кампанія па сушцы збожжа не праводзіцца.

Зусім ня зьвернута ніякай ўвагі на здачу хлеба індывідуальнымі гаспадаркамі. Мясцовыя органы забыліся, што ў пляне хлебазагатовак Беларусі хлеб індывідуальных гаспадарак займае вялікае месца.

Зусім недаацэнена значэньне грамадзка-масавай работы і сацыялістычнага спаборніцтва. Члены сельсаветаў і камісій садзейнасьці, якія павінны былі быць у першых калёнах здачыкаў хлеба, у большасьці раёнаў яшчэ ня здалі нават свой хлеб.

Удзел ніязвых прафсаюзных і камсамольскіх ячэек у хлебазагатоўчай кампаніі яшчэ не адчуваецца

Весткі, якія ёсьць, сьведчаць аб слабай гібкасьці загатоўчых арганізацый пры скарыстаньні тых фондаў, якія вызначаны для прэміяваньня здачыкаў хлеба. На мясцох ня здолелі арганізаваць работу так, каб у раёнах, у якіх не хапае прамтавараў, здатчыкі хлеба атрымлівалі абавязацельствы пад прамтавары.

Усё яшчэ не разгорнута барацьба з кулаком і спэкулянтам, якія ва ўсю ўжо прыступілі да скупкі хлеба.

З усіх гэтых фактаў мы павінны зрабіць адпаведныя вывады. Трэба неадкладна спыніць усякія гутаркі пра тое, што ў Беларусі няма чаго сьпяшацца і што яшчэ рана разгортваць загатоўкі. **Кожны ўпушчаны дзень б'е па выкананьні нашых плянаў.**

З 1-га верасьня БССР уступае ў загатоўкі роўна з асноўнымі збожжавымі раёнамі СССР. Мы ня можам дапусьціць, каб рэальны плян хлебазагатовак ня выконваўся своячасова, каб мы пляліся ў хвасьце.

Усе партыйныя арганізацыі, уся грамадзкасьць вёскі і гораду — на барацьбу за хлеб!

Мы павінны дабіцца, каб БССР, як і летась, была першай па выкананьні свайго пляну хлебазагатовак.

Арк.

На 23,6 проц.

ВЫКАНАНЫ МЕСЯЧНЫ ПЛЯН ХЛЕБАЗАГАТОВАК

Саюзхлебам на 25-га жніўня загатоўлена 28 тон хлебных культур.

Па сыстэме паляводсаюзу на 25-га жніўня ёсьць весткі толькі з 31 раёну, якія загатовілі 761 тону ці 88,5 проц. месячнага заданьня. З гэтай колькасьці капгэсамі здадзена 727 тон і кантрактантамі 23 тоны.

Па лініі Белкаапсаюзу ёсьць весткі толькі з 13-ці раёнаў аб загатоўках на 20-га жніўня. 13-ю раённымі спажывецкімі т-вамі загатоўлена 146 тон.

Усяго ўсімі загатоўшчыкамі з пачатку кампаніі па 25-га жніўня, паводле зусім няпоўных вестак, месячны плян загатовак выкананы ўсяго толькі на 23,6 проц.

Траба адзначыць вельмі слабое паступленьне вестак аб ходзе загатовак з усіх загатоўчых арганізацый, асабліва, па лініі спажывецкай кааперацыі,

Патрэбна яшчэ адна чыстка

БЫХАЎ. (Наш кар.). Ціха, ціха цячэ жыцьцё ў Быхаўскім райкалгассаюзе. Што ім да хлебазагатовак, да баявых заданьняў, да кантрактацыйных дагавароў? Сяляне ў выкананьне сваіх абавязкаў па кантрактацыі вязуць хлеб, а дагавары ў парадак ня прыведзены, няма картак кантрактантаў, не занесены авансы, не пасланы выпіскі сельсаветам, дагавары не перададны Быхаўскаму спажывецкаму таварыству.

Старшыня калгассаюзу сядзіць у сваім крэсьле, і дождж над ім ня капае.

На запытаньне, дзе патрэбныя тэмпы, — загадчык гандлёвай часткі адказвае: «бачыце, тут патрэбна яшчэ адна чыстка апарату». Ацэнка бязумоўна самакрытычная і зусім аб'ектыўная.

Райспажывецкае таварыства прыслала працаўніка для прыёму кантрактацыйных дагавароў, ніхто яму не дапамагае, ён ня ведае, што рабіць.

Райкалгассаюз нічога ня робіць для пашырэньня датэрміновай здачы кантрактаванага збожжа.

— Бачыце, тэрмін здачы яшчэ толькі ў верасьні — спакойна адказвае загадчык гандлёвай часткі, які паважае самакрытыку.

Падам адну лічбу, якая даводзіць, як уважліва адносіцца калгассаюз да хлебазагатоўчых плянаў. Калгас імя тав. Галадзеда можа здаць каля 35 тон аўсу, а паводле пляну райкалгассаюзу ён павінен здаць 7 тон. Наогул, плян здачы збожжа калгасамі яшчэ не прапрацаваны.

Здаецца, зусім мае рацыю загадчык гандлёвага аддзелу — патрэбна яшчэ адна чыстка апарату калгассаюзу.

Л—ц.

Чырвоны абоз--сьнег на галаву загатоўцаў

ДРЫСА. (Брыгада «Зьвязды»). Безадказныя бюракратычныя адносіны да хлебазагатовак аднуваюцца ва ўсёй рабоце раённых арганізацый. Ніякай грамадзкай работы на разгорнута, ні адзін сельсавет раёну на абмеркаваў пляну хлебазагатовак. Групы беднаты ня скліканы, вёскі нічога ня ведаюць аб пляне загатовак. Не даны цьвёрдыя заданьні кулакам.

Старшыня Росіцкага сельсавету Канвальчык заявіў: «у нас кулакоў няма, калгасы пішкі здадуць, сялянства яшчэ не прыступіла да малацьбы, і сьпяшацца няма куды».

Спажыўтаварыства не адрамантавала склады. Быў выпадак, калі першы чырвоны абоз калгасу, як сьнег зваліўся на галаву загатоўцаў. Яны прымушаны былі ссыпаць збожжа ў старое неадрамантаванае, недазьмянфецыраванае памяшканьне. Ніхто ня сустрэў абоз. Апошні чакаў тры гадзіны капа складу, пакуль зьявіўся прыёмшчык.

Супроцьпажарная ахова загатоўчых пунктаў не наладжана.

Зусім няма тары. Некаторыя калгасы —«Правда», «Чырвоны Прамень» ня маюць магчымасьці наладзіць чырвоныя абозы з-за адсутнасьці тары.

Загатоўлена па раёне ўсяго толькі 6 тон. Жнівеньскі плян выкананы самацёкам на 30 проц.

Брыгадзір І. КУРГАН.

Прамтавары--лепшым здатчыкам хлеба

Наркамгандлю вылучыў спэцыяльны фонд прамтавараў для прэміяваньня здатчыкаў. Фонд вызначаны ў 820.000 р. Здатчыкі будуць прэміявацца бавоўнянымі таварамі, суконнымі таварамі, таварам вопратавым і ваўнянымі хустамі.

Разьмеры выдзеленых фондаў поўнасьцю забясьпечваюць патрэбныя тэмпы загатовак.

Але па сёнешні дзень гэтыя тавары ў БССР яшчэ не паступілі, ня гледзячы на ўсе напаміненьні Саюзнаму Наркамгандлю. Саюзны Наркамгандаль у першую чаргу адгружае прамысловые тавары ў асноўныя хлебазагатоўчыя раёны, а адгрузка вылучаных фондаў для БССР пачнецца толькі ў верасьні.

У сувязі з даўжэйшчым становішчам з прамтаварамі, на мясцох неабходна ажыцьцявіць пастанову СНК БССР аб выдачы здатчыкам хлеба абавязацельстваў на выдзеленыя для прэміяваньня іх прамтавары. Здатчыкі хлеба па гэтых абавязацельствах змогуць атрымаць пасьля завозу ў БССР выдзеленых прамтавараў, належачыя ім нормы прэміяваньня.

РАБОТА ТОЛЬКІ ПАЧЫНАЕЦЦА

КАЛІНКАВІЧЫ. (Наш кар.). У той час, калі хлебазагатоўчая кампанія павінна была ўжо разгарнуцца на ўсю шырыню, — па Ліпаўскім сельсавеце ніякай падрыхтоўкі не рабілася і ня робіцца. Камісія садзейнасьці яшчэ ня склікана. Плян загатовак да вёскі не даведзены. Старшыня сельсавету Дрозд замест таго, каб распачаць работу на хлебазагатоўках, даў водпуск сакратару сельсавету, а сам пасхаў невядома куды, не паведаміўшы свайго намесьніка, забраўшы ключы ад канцыляры.

Інструктары Калінкавіцкага спажывецкага таварыства, якія былі ў сельсавеце, нават не пацікавіліся тым, як ідуць хлебазагатоўкі. Інструктар заключыў умову з саўгасам на прыём хлеба і зусім не запытаўся, як ідзе падрыхтоўка, ці даведзены плян да вёскі.

Нядаўна прыбыў у сельсавет інструктар Саюзхлеба, які цэлы дзень шукаў сельсаветчыкаў і толькі ўвечары знайшоў намесьніка старшыні. У той-жа вечар быў скліканы прэзыдыум сельсавету, абмеркаваны плян загатовак, абрана камісія садзейнасьці. Праца толькі пачынаецца.

ЦУРКО.

СТАЛОВАЯ № 9 БУДЗЕ ПАШЫРАНА

Камэнданту Дома Селяніна Рубашкіну абвешчана вымова за бюракратычныя адносіны да грамадзкага харчаваньня

Сталоўка № 9 у Доме Селяніна прапускае амаль штодзенна каля 1.700 чалавек. Там абедаюць і вечэраюць пераважна рабочыя заводу «Камунар», фабрыкі «Беларуска» і будаўнікі бліжэйшых пабудоў. Сталоўка перагружана, бо фактычна яна разьлічана толькі на 500 чалавек. Ля сталоў часта можна заўважыць чаргі. Памяшканьне кухні вельмі цеснае.

Загадчык сталоўкі, кухар і ўвесь персанал доўга шукалі выйсьця з гэтага становішча. Нарэшце ім прышлі на дапамогу самі рабочыя — вылучылі брыгаду, якая абсьледвала падрабязна становішча сталоўкі.

Рабочыя хутка знайшлі выйсьце. Тут жа, побач з памяшканьнем сталоўкі рабочая брыгада знайшла зусім вольны пакой. Да нядаўняга часу ён быў завалены ўсякім старым хламам. Некалькі дзён таму назад камэндант Дому Селяніна Рубашкін вызваліў гэты пакой і абярнуў яго ў «сваю ўласную сталоўку»—расставіў там некалькі сталоў і крэслаў і заўсёды там абедаў і вячэраў з сваімі таварышамі. (Дарэчы кажучы, абеды ён заўсёды патрабаваў ад пускаць яму па-за чаргой).

Рабочая брыгада ў сваіх вывадах прапанавала перадаць гэты пакой сталоўцы, каб пашырыць апошнюю. Але ініцыятыва рабочых сутыкнулася з абуракратызмам Рубашкіна.

Што яму да рабочых. Што яму да таго, што яшчэ 400 рабочых змогуць атрымліваць абеды ў гэтай сталоўцы.

Патрабавалася ўмяшальнасьць рэдакцыі газэты «Зьвязды» і ЦКК РСІ. Але Рубашкін не здаваўся. Бачыце, гэты пакой яму патрэбен для прыбыральшчыц, якія будуць там пакідаць сваю вопратку. Гэта ў той час, калі 100 работнікаў сталоўкі трымаюць сваю вопратку ў маленькім пакойчыку.

Рубашкін ні ў якім разе не хацеў ура зумець, што інтарэсы 400 рабочых стаяць значна вышэй, чым яго асабістыя. Для прыбіральшчыц-жа ў Доме Селяніна ва ўсякім выпадку можна знайсьці і інш. месца.

Калегія РСІ дала па заслугах гэтаму бюракрату.

За бюракратычныя адносіны да справы грамадзкага харчаваньня пастановай НК РСІ Рубашкіну абвешчана вымова. Загадчыку Дому Селяніна т. Серба прапанавана ў працягу 24 гадзін перадаць пакой для сталоўкі № 9.

Пачатак сэзону ў БДЯТ

Яўрэйскі Дзяржаўны тэатр пачынае 9 верасьня свае гастролі ў Гомелі. Апроч п'ес «Джым Купэркопф» і «Баранцьба машын», рабочы-глядач Гомелю ўбачыць: «Выстрэл»—Бязыменскага і п'есу Дабрушына «На 62-м». Гэта п'еса, над якой зараз працуе калектыў тэатру, малое жыцьцё калгасу.

„РЫОНГРЭС"

На р. Рыоне, блізка ля Кутаіса, будуецца магутная гідра-электрастанцыя «Рыонгрэс. Пабудова была распачата ў 1927 годзе. Зараз канчаецца пабудова грэблі.

На здымку: тунэль. Па гэтай тунэлі будзе пушчана вада ў турбіны станцыі.

Новае—у калдагаворнай кампаніі

Прэзыдыум ЦП саюзу дрэваапрацоўшчыкаў у гэтым годзе праводзіць упяршыню вопыт самастойнага заключэньня дагавароў фабрычных прафарганізацый з прадпрыемствамі. Для самастойнага заключэньня дагавароў вылучаны фабрыкі «Калпраца» ў Нова-Беліцы, «Зьвязда» ў Капцэвічах, завод імя Томскага ў Рэчыцы, «Пралетары» і «Кастрычнік» у Мазыры, «Камінтэрн» у Нова-Барысаве.

Усебеларускі палітэхнічны зьезд

15 верасьня ў Менску адкрываецца палітэхнічны зьезд, на якім будзе прысутнічаць 400 дэлегатаў. Таксама будуць прысутнічаць на зьезьдзе 40 рабочых ад буйных прадпрыемстваў, 20 прадстаўнікоў калгасаў і саўгасаў і 20 прафэсыянальных работнікаў.

Справачнік пайшчыка

— Талбёны, выдадзеныя на тэрмін да 1-га верасьня, сапраўдны да 10-га верасьня.

— 2-га верасьня пачынаецца выдача талёнаў на дэфіцытныя тавары. У першую чаргу талёны будуць выдавацца саюзам дрэваапрацоўшчыкаў, мэталістых, гарбароў, камунальнікаў і мэдсанпрацы.

— Па дзіцячых кніжках на талён ружовага колеру № 45 будзе адпушчацца чэрэць кілё бульбянай мукі, на № 47 таго-ж колеру—кілё павідлы.

ЦІШ ГАБІНЭТАЎ ЦІ КАЛГАСНАЕ ПОЛЕ?

З 50 работнікаў для дапамогі раёнам выехала толькі 15

20-га жніўня калегія Наркамзему БССР вынесла пастанову аб неадкладнай пасылцы ў раёны 50 работнікаў, каб дапамагчы месцам ва ўборачнай кампаніі і падрыхтоўцы да асеньняй сяўбы. У першую чаргу пастанова датычылася спэцыялістых (апроч каморнікаў).

Белкалгассаюз павінен быў паслаць на раён на працягу двух дзён 7 спэцыялістых, Белпаляводсаюз — 8, Белжывёлаводсаюз — 4, Белсельбуд — 3, Навукова-Дасьледчы Інстытут — 5, Белплодагародніна — 2 і г. д.

Што-ж мы маем на сёнешні дзень?

Большасьць адпаведных устаноў катэгарычна адмовілася выканаць пастанову калегіі Наркамзему, лічачы сябе «пасынкамі», чаму, моў, рука калегіі карае нас, а ня іншых...

«Іван ківае на Пятра, а Пётра на Івана».

А пакуль што, з Паляводсаюзу, дзе працуюць 22 спэцыялісты, ня выехаў ні адзін; ніводзін ня выехаў і з жывёлаводсаюзу (15 спэцыялістых), Белсельбанку (11 раз'ядных інструктароў, 4 агрономы і 5 эканамістых-інспэктароў), ільняна-канаплянага аб'яднаньня (6 спэцыялістых)...

Абураючыя адносіны да гэтае справы праявіў Навукова-Дасьледчы Інстытут. Ён прадставіў Наркамзему сьпіс 5 «мёртвых душ», якія нібыта паедуць працаваць. У сапраўднасьці, двое са сьпісу НДІ ўжо даўно ў іншай камандыроўцы, а трое ў адпачынку...

Для расьсьледваньня матар'ялаў, зьмешчаных нядаўна ў «Зьвязьдзе», учора выехаў на Гомельшчыну член калегіі НКЗ тав. **Бондараў.** Разам з ім выехалі чатыры супрацоўнікі Наркамзему.

Такім чынам, на сёньня, разам з работнікамі НКЗ, у раёнах з 50 мабілізаваных працуюць толькі 15...

Юр.

ЗА ДЗЕНЬ

— 3-га верасьня ў Маскве адкрываецца **міжнародны кангрэс рэвалюцыйных дрэваапрацоўшчыкаў.** Ад рабочых—дрэваапрацоўшчыкаў БССР на кангрэс едзе ўдарнік Бабруйскага камбінату тав. **Макс.**

— 1 верасьня пачынаюць працаваць 6-цітыднёвыя курсы па падрыхтоўцы **клюбных работнікаў.** На курсах займаецца 40 чалавек.

— Пры Наркампрацы арганізавана ячэйка па **стандартызацыі,** якая будзе загадваць пытаньнямі стандартызацыі прамысловых вырабаў і пабудоў.

— Месячнік вывазкі лесу працягнуты да 15-га верасьня.

— Біржа Працы пачынае прымаць на вучот жонак нізка аплачваемых груп рабочых.

— Магазын Белдзяржвэймашыны атрымоўвае гэтымі днямі з Масквы 35 вэлісыпэдаў заводу АМО. Выдаваецца яны будут выключна праз Аўтадор і ашчадныя касы.

МЕНСК

Справа работнікаў МЦРК і Белкаапсаюзу

БУДЗЕ СЛУХАЦЦА 5 ВЕРАСЬНЯ

Пракуратурай закончана сьледзтва па справе работнікаў МЦРК і Белкаапсаюзу, вінаватых у зрыве забесьпячэньня Менску гароднінай. 5 верасьня справа гэта будзе слухацца ў вярхоўным судзе БССР. Перад судом стануць — былы загадчык фруктова-гароднай частні МЦРК — Бужын, яго намесьнік Юдвіч, кладоўшчык Бярозкін, і кансультанты Белкаапсаюзу Вальфсон і Гордзін.

Перад пачаткам навучальнага году

— Да сёнешняга дня на **факультэт савецкага будаўніцтва** пададзены 93 заявы, народнай гаспадаркі—488 заяў, на пэдфак—680 заяў. Прыём заяў у ВНУ працягнуты да 5 верасьня. 1 верасьня пачынаюцца заняткі на пэдфаку.

— Сёньня пачынаюцца заняткі на ранішнім рабочым факультэце. Прыём заяў на беларускае аддзяленьне рабфаку, скончаны, на іншыя аддзяленьні працягнуты да 5-га. Іспыты пачынаюцца 10-га.

У нацкамісіі БССР

Нацыянальная камісія ЦВК БССР прыняла рад пастаноў аб перабудове работы нацкамісій у сувязі з ліквідацыяй акруг.

Адказнасьць за правядзеньне нацпалітыкі ўскладаецца на раённыя і гарадзкія савецкія і прафэсыянальныя органы. Для кіраўніцтва і кантролю за правядзеньнем нацпалітыкі на мясцох арганізуюцца раённыя і гарадзкія нацкамісіі. У 5 больш буйных гарадох БССР —Менску, Віцебску, Гомелі, Магілеве, Бабруйску—мяркуюцца асобныя нацменаўскія інспэктары.

Нацкамісія пастанавіла аб тым, што ўсе наркаматы і цэнтральныя ўстановы павінны арганізаваць улік пастаноў ураду аб нацпалітыцы і ўстанавіць кантроль за іх выкананьнем. НК РСІ уключае ў свой плян работы кантроль за выкананьнем пастаноў ураду аб нацпалітыцы.

Досыць важнай зьяўляецца пастанова нацкамісіі ЦВК аб арганізацыі груп лектароў і дакладчыкаў у буйных пралетарскіх цэнтрах БССР для абслугоўваньня працоўных нацменшасьцяй у мястэчках і на вёсцы. Нацкамісія прапанавала НКА увесьці ў с-г. акадэміі, на факультэце савецкага будаўніцтва, у мэдінстытуце курс яўрэйскае і польскае мовы і літаратуры для студэнтаў адпаведных нацменшасьцяй.

Зараз нацкамісія праводзіць абсьледваньне татарскага працоўнага насельніцтва БССР.

Мыла з мінэраляў

На мылаварным заводзе «Трудхим» у Тыфлісе арганізаваны выраб мыла з тлустай гліны «гумбрын», неабмяжаваныя запасы якой выкрыты ў Кутаіскім раёне.

У склад мыла гліна ўваходзіць у колькасьці да 55 проц. масы. І такім чынам вызваляе з вытворчасьці да 192.000 клгр. алею.

Якасьць мыла дасканалая. Завод выпусьціў на рынак ужо некалькі дзесяткаў тон гэтага мыла, а ў працягу году выпусьціць усяго да 3.000 тон мыла.

На здымку: мыла выробленае з гліны.

Новы тэкстыльны сырэц

Сухумскае аддзяленьне інстытуту прыкладной батанікі з посьпехам правяло досьлед па ўвядзеньні ў Закаўказьзі кітайскае прадзільнае расьліны «рамі». Гэта расьліна ДАЕ ЎРАДЖАЙ ДВА РАЗЫ Ў ГОД. Збор валакна ад рамі атрыманы памеры 2 з палов. тон з га, у той час, калі пён дае ня больш тоны. Якасьць валакна вельмі высокая, тканіна з рамі—тонкая і шаўкавістая, а моцнасьць у тры разы большая супроць ільняной ніткі. Культура перададзена інстытутам для прамысловай эксплёатацыі.

Сёйета пад рамі занята 60 га, у будучым плошча пад рамі павялічваецца да 20.000 га, а 1932 годзе—75.000 га.

На здымку:—куст рамі.

Што перадае Менская Радыёстанцыя

ПАНЯДЗЕЛАК, 1-га ВЕРАСЬНЯ

18-00—Пасьляабедзены канцэрт
18-30—Час Дому Санасьветы
19-00—Беларуская радыё-газэта
20-00—Праверка часу
20-00—Сялянская радыё-газэта
21-00—Перадача на польскай мове
21-30—Даклад: задачы міжнароднага юнацкага руху.
22-00—Канцэрт.

АЎТОРАК, 2-га ВЕРАСЬНЯ

18-00—Пасьляабедзены канцэрт
18-30—Перадача для піянэраў і вучняў
19-00—Беларуская радыё-газэта
20-00—Праверка часу
20-00—Літаратурна - музычная перадача
21-00—Даклад: уражаньне замежных дэлегатаў ад калгасу «Расьсьвет—Пераможца», на мове эсэранто
21-30—Даклад: сельсаветы і задачы калектывізацыі сельск. гасп.
22-00—Канцэрт.

СЕРАДА, 3-га ВЕРАСЬНЯ

18-00—Пасьляабедзены канцэрт
18-30—Студэнцкая перадача
19-00—Беларуская радыё-газэта
20-00—Праверка часу
20-00—Беларуская работніца і сялянка па радыё
21-00—Даклад: задачы Беларускага Рабоча - Сялянскага Радыё-Унівэрсытэту.
21-30—Даклад: уборка і захоўваньне лубіна.
22-00—Канцэрт

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

4-га верасьня скліхаецца канфэрэнцыя прызыўнікоў 1908 г. Канфэрэнцыя адбудзецца ў клюбе Працаўнікоў Асьветы. Яўка прызыўнікоў-камсамольцаў абавязкова. Запрашаецца беспартыйная моладзь.

Фрунзаўскі РК ЛКСМБ.

БАН. 2-га верасьня, а 12 гадз. дня ў памяшканьні БАН (3-ці паверх, пакой № 5), у Катэдры Марксызму-Ленінізму адбудзецца сход усіх навуковых працаўнікоў і асьпірантаў Катэдры. Прысутнасьць абавязкова.

Сад Асьветы. 1-га верасьня—кіно «Гоншчык супроць волі». Пачатак а 9 гадзіне 30 хвіл. увечары. У выпадку дрэннага надвор'я—пераносіцца ў Дом Асьветы.

Час. вык. абав. адказ. рэдактара
А. МІТЛІН.

Ячэйка КП(б)Б Нарсувязі з глыбокім жалем паведамляе аб сьмерці члена партыі ячэйкі сувязі, загконта

тав. КРАТОВІЧА У. У.

Прэзыдыум цэнтральнага праўленьня саюзу сувязі Беларусі выказвае свае спачуваньне СЯМ'І ПАМЕРШАГА 31 жніўня г. г. заг. Менскай п.-т. канторы

У. У. КРАТОВІЧА

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ"
СЁНЬНЯ, 1 верасьня
2-гі ТЫДЗЕНЬ 2-гі
НЯМЕЦКІ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ
НАЧНЫ КРЫК
Драма ў 7 частках.
Пачатак 1-га сэансу а 7 гадзіне.
Каса адкрыта з 5 гадз.

З панядзелка, 1 верасьня
АДКРЫВАЕЦЦА
ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР
„ЮНЫ ПІЯНЭР"
НА ЭКРАНЕ НОВАЯ КАРЦІНА
- САПРАЎДНЫЯ ПАЛЯЎНІЧЫЯ -
У карціне прымаюць удзел: ТЫГРЫ, МЯДЗЬВЕДЗІ, ВАЎКІ і інш. жывёлы.
ПАЧАТАК 1-га сэансу а 2 гадзіне дня, 2-га сэансу а 3 гадз. 30 м.
— Каса адкрыта з 12 гадз. дня. —
ПЛАТА ЗА ЎВАХОД:
дзеці—10 кап.; дарослым—20 кап.

Кіно-тэатр „КУЛЬТУРА".
З прычыны вялікага посьпеху яшчэ 3 дні | З панядзелка, 1 верасьня
ЗЭЛІМ ХАН
драма ў 6 частках.
Пачатак сэансаў: а 7 гадз., 8 гадз. 40 м. і 10 г. 20 м.
КАСА адкрыта ад 5 гадз.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"
З ПАНЯДЗЕЛКА, 1 ВЕРАСЬНЯ
Мастацкі фільм
=ПАВАРОТ=
драма ў 6 частках
У ГАЛ. РОЛ.: Н. І. МІЧУРЫН
Н. І. СІМОНАЎ
Г. І. УВАРАЎ
Е. ЯГОРАВА
ПАЧАТАК 1-га СЭАНСУ а 7 г.
КАСА—ад 5 гадз.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР
1, 2 верасьня
„АВАНГАРД" п'еса ў 4-х дзеях. В. Катаеў.
Пастаноўка С. Разанава і К. Саньнікава. Мастак Ю. Гольц. Музыка В. Сакалова. Дырыжэр І. Гітгарц. Кіраўнік хору М. Кауфман. Паказ вядзе С. Калпашнікаў.
Пачатак роўна а 8 г. 30 м. | Білеты прадаюцца ў касе тэатру, у рабочай касе і на Усебеларускай выстаўцы.

Кіно „СПАРТАК"
З панядзелка, 1 верасьня
НЯМЕЦКІ БАЯВІК
ВАРЭТЭ
драма 7 частках.
У гал. ролях: Эміль Янінгс і ЛІА да-Пуці.
Пачатак сэансаў: 7 г., 9 г., 10 г. 45 м.
КАСА—ад 6 гадз.

Мастацкі ЦЫРК | Пад кіраўніцтвам І. Л. СТРАШЭВІЧА
Панядзелак, 1 верасьня
ВЯЛІКАЕ ГАСТРОЛЬНАЕ ПРАДСТАЎЛЕНЬНЕ
пры ЎДЗЕЛЕ ЎНОЎ ПРЫБЫЎШЫХ ГАСТРАЛЁРАЎ
3 БРЭНДЗІ ролікабежцы | 3 МІРАЛЬДО гледыятары | 5 РОСІНІ акрабаты | 2 КАНВАЛЬДЗІ бытавыя сатырыкі | Ян. БОНІ эксцэнтрык
—) І ЎВЕСЬ СКЛАД ТРУПЫ (—
Праграма ў 3-х вялікіх аддз. 14 №№
УВАГА: Прызначаная на сёньня гастроль ЛОНГО адмяняецца
Пачатак а 8 г. 30 м. веч.
Канфэрансье Е. А. Яўгеней.
Адказны кіраўнік І. Л. СТРАШЭВІЧ.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ
у Аршанскі Тэкстыльны Тэхнікум
працягнут да 10 верасьня г. г.

ЦП саюзаў швэйнікаў, гарбароў і саўгандальслужачых
СКЛІКАЮЦЬ
ШЫРОКУЮ
ГАРАДЗКУЮ КАНФЭРЭНЦЫЮ
па пытаньні якасьці прадукцыі і абслугоўваньня рабочага спажыўца.
Канфэрэнцыя адбудзецца 3 верасьня а 6 гадз. веч. у клюбе друкароў (Ленінская, 13).
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Даклады дырэктароў швэйнай фабрыкі «Кастрычнік» і абутковай ф-кі аб якасьці прадукцыі.
2. Садаклады рабочых брыгад і бракераў.
На канфэрэнцыю павінны зьявіцца рабочыя ф-кі «Кастрычнік» і абутковай ф-кі, а таксама прапаўнікі абутковых і гатовага адзеньня магазынаў.
Запрашаюцца прадстаўнікі НК РСІ, НКГ, БКС, ЦСПСБ, ВСНГ, вытворч. саюзаў, квапактыў, рабочыя спажыўцы і прадстаўнікі рэдакцый газэт.
ЦП саюзаў швэйнікаў, гарбароў, саўгандальслужачых.

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
Да ведама школ райінспэктароў, гарінспэктароў і кнігагандлёвых арганізацый.
ВЫШЛІ З ДРУКУ І РАЗАСЛАНЫ ПА КНІГАГАНДЛЁВАЙ СЕТЦЫ.
1. ДЭТАЛІЗАВАНАЯ ПРАГРАМА і мэтадычная запіска для «О» групы. Стар. 24. Цана 12 кап.
2. ДЭТАЛІЗАВАНЫЯ ПРАГРАМЫ для I і II груп 4-х і 7-гадовай савецкай палітэхнічнай школы (гарадзкі адменьнік). Стар. 25. Цана 10 кап.
3. ДЭТАЛІЗАВАНЫЯ ПРАГРАМЫ для III і IV груп чатырох і сямігадовай савецкай палітэхнічнай школы (гарадзкі і вясковы адменьнік). Стар. 66. Цана 35 к.
4. ПРАГРАМЫ і мэтадычныя запіскі па фізычным выхаваньні для I і II канцэнтру сямігадовай савецкай палітэхнічнай школы. Стар. 104. Цана 40 кап.
5. ПРАГРАМА і мэтадычныя запіскі па апрацоўцы мэталю і дрэва для II канцэнтру сямігадовай савецкай палітэхнічнай школы. Стар. 27 Цана 65 кап.
6. ПРАГРАМЫ і мэтадычныя запіскі па прыродазнаўству і хэміі для II канцэнтру сямігадовай савецкай палітэхнічнай школы. Стар. 40. Цана 35 кап.
7. МАКЛЮК І ПРУДНІК.—Праграма для занаткаў з дарослымі ў школах граматы і мэтадычны дапаможнік да лемантара «Ударнік». Стар. 96. Цана 30 к.

БЕЛАРУСКІ РАДЫЁ-ЦЭНТР
ГЭТЫМ ПАВЕДАМЛЯЕ,
што ва ўсіх раённых цэнтрах БССР установлены РАДЫЁ-ПРЫЁМНІКІ для прыёму распараджэньняў і дырэктыў ЦК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР, ЦСПСБ, наркаматаў, прафсаюзаў і іншых дырэктыўных органаў і арганізацый.
Распараджэньні будуць перадавацца праз Менскую Радыё-Станцыю штодзенна ад 13 да 15 гадзін, пачынаючы з 5-га верасьня г. г.
Усе установы адбіткі распараджэньняў, якія яны будуць перадаваць праз радыё, абавязкова дасылаюць поштай паказаным у распараджэньні адрасатам.
ПЕРАДАДЗЕНЫЯ РАДЫ�ЁГРАМЫ Ў ДРУГІ РАЗ ПЕРАДАВАЦЦА НЯ БУДУЦЬ.
Перадача радыёграм будзе адбывацца за плату, якая ўносіцца пры падачы радыёграмы або ўстановы ўносяць аванс.
Кошт слова устанаўліваецца, згодна наступнай таблісы з множаньнем на колькасьць пунктаў, а менавіта:

Да 5 пунктаў	—	7 кап. за слова	
Ад 6 да 10 пунктаў	—	6 » » »	
» 11 » 25 »	—	5 » » »	
» 26 » 40 »	—	4 » » »	
» 41 » 60 »	—	3 » » »	
» 61 » 100 »	—	2 » » »	
Звыш 100 пункт.	—	1 » » »	

ПРЫКЛАД: Радыёграма 50 слоў для 100 раёнаў будзе каштаваць 50.2.100=100 руб., або звыш 100 пункт.: 50.1.100=50 руб.
Радыёграмы прымаюцца напісаныя на машынцы з поўным паказаньнем адрасату і назвы ўстановы. Радыёграма павінна быць напісана ў самым сьвіслым выглядзе (бяз лішніх слоў) і абавязкова на беларускай мове.
У радыёцэнтр радыёграмы павінны паступаць не пазьней 11 гадз
Нам. упоўнаважанага НКПІТ МАСЭВІЧ
Заг. радыёвяшчаньнем БРЦ НАЎМЁНАК

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА КАМІТЭТУ ЎЗАЕМАДАПАМОГІ
Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Саветаў,
АДКРЫТА ад 9 гадз. рэн. да 9 г. веч.
Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях:
па ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурана-вэнэрычных, страўніцкіх, нэрвовых.
Электра-сьвета-лячэньне і ванны адкрытыя 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.
Рэнтген (здымкі, прасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 6 г. да 8 г. увеч.
ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. веч. штодзенна
Кансультацыя прафэсароў па ўсіх спэцыяльнасьцях па папярэднім запісе.
Урачэбная дапамога на даму па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запісь з 9 гадз. раніцы да 9 гадз. веч.
Прыём хворых па лекавых кніжках камітэту Для ўсіх іншых грамадзян за агульнадаступную дыфэрэнцыяваную плату.

Згубленыя і ўкрадзеныя дакуманты

лічыць несапраўднымі:

Праф. вуч. карт. саюзу СГЛР, талён зьяняцці з вучоту, выд. Грэск. РК СМБ на імя Давідоўскага В. А. 2194-2195
Мэтр. вып. Сянкевіча А. П., выд. н. ЗАГС'ам 2196
Канд. карт. № 16053, выд. Мен. АК (б)Б, асабов. пасьведч., выд. кір. ўраў СНК БССР на імя Каратквіча К. 2197-2198
Біржа. карт. Фідэльман К. А., выд. н. біржа працы. 2199
Вайск. кн., выд. Мазырск. ваенкаматам, чл. біл. Асоавіяхіму, выд. яч. Асоавіяхіму 6 стр. п. Кандраценка Д. І. 2200-2001
Біржа. карт. Арончык М. С., выд. Мен. біржай працы. 2102
Чл. біл. саюзу будаўнікоў Гандыша Я. Я. 2203
Чл. біл. саюзу Нарсувязі Рухлевіча Ю. Ц. 2204
Асабов. пасьведч., выд. Сарапульск. міліцыяй Рагожневай С. В. 2205
Даведка аб нарадж. дзіцяці Трусевіч В. Э., выд. Мен. ЦРД 2206
Чл. біл. саюзу СГС № 2826, асабов. пасьведч. Мен. аддз. Белкаапсаюзу на імя Панкевіча В. Ф. 2207-2208
Чл. біл. саюзу чыгуначн. № 22841 Мачулайціса В. А. 2209
Мэтр. вып. Рубіна А. Б., выд. Мен. ЗАГС'ам. 2210
Чл. біл. саюзу СГЛР № 95458 Парфіновіча Ф. Б. 2211
Пэнс. кн. Блізьнюка Н. Л., выд. вуч-страхкасай МБЛ ч. 2212
Мэтр. вып. Манькоўскага Г. Ч., выд. 1 прыг. с./с., Мен. акр. 2213
Даведка Макарэвіч Л. Я., выд. Мен. ЦРД. 2214
Вайск. кн. Тумара І. М., выд. Смалявіцк. РВК 770
Вайск. кн. Мялешка М. А., выд. Смалявіцк. РВК 771
Каап. кн. № 92 Корбут М., выд. Клясьніцк. спаж. т-вам 772
Мэтр. даведка Каца Е. С. 772
Вуч.-конск. карт., асабов. пасьведч. Заяца Я., выд. Халхолец. сельсаветам 773
Камсам. біл. № 42034, студ. біл, выд. М.-Горск. с.-г. тэхнікумам Буянова І. Я. 774
З больн. бюлет. Яўсеевіча В. Ц., выд. Капцэвіцк. амбул. 775
Вайск. кн. Маскалёва М. І., выд. Краснапольск. РВК 776
Чл. біл. саюзу мэдсанпрацы, вайск. кн., выд. Чавуск. РВК па імя Рыбакова Ц. К. 777-778
Вайск. кн. № 68 Новіка І. Я. 779
Вайск. кн. Шчэрба Т. Б., выд. Сьмілав. РВК 780
Вайск. кн. Верыка М. В., выд. Мен. ваенкаматам 781
Парт. біл. № 1042643, вайск. біл., выд. 70 кав. п., чл. біл. Асоавіяхіму, чл. біл. СВБ Варакса І. М. 782
Пэнс. кн. Шэлека М. І., выд. Пухавіцк. страхкасай 783
Вайск. кн. Старобінца Д. І. 783
Вуч.-конск. кн. Ламака А. Л. 785
Мэтр. даведка Шпат А. Ф., выд. Бягомльск. ЗАГС'ам 786
Біржа. карт. Дакура О. А., выд. Барысайск. біржай працы 787
Вуч.-конск. карт. № 432 Гільмана Д. 788
Пасьведч. аб сканч. 7-годкі, пасьведч. аб сац. стан. Ясюка А., выд. Лошніцк. сельсаветам 789
Паявая кн. Іванова Н., выд. Сіроцінск. спаж. т-вам 790
Вайск. кн. Сіўцова Е., выд. Заравуск. РВК 791
Пашп. Еранковай М. В., выд. Чавуск. райміліцыяй 792
Вайск. кн. Мядзьведзева А. І., выд. Чавуск. РВК 793
Канд. карт. № 34387 Мядзьведзева А. Я., выд. Чавуск. РК КП(б)Б 794
Вайск. біл. № 66 Шкіленка І. А., выд. Мен. ваенкаматам 795
Паявая кн. Грыгор'ева І. Г., выд. Сі- 796
Паявая кн. Грыгорьева І. Г., выд. Сіроцінск. спаж. т-вам 795
Мэтр. вып. Пучынскай Ф. 797
Літар на праезд Слуцак—Старадуб Казлова М. 798
Чл. біл. саюзу мэдсанпрацы Ершова П. 799
Паявая кн. № 82 Каждана В., выд. Бярэзінск. спаж. т-вам 800
Вуч.-конск. кн. № 4034 Сампа Ф., выд. Бярэз. РВК 801
Вуч.-конск. кн. Барановіча А. Д., выд. Бярэзінск. РВК 802

КСНХ
СЕВКАВУКРПРОМСТРОЙ
ЗАОЧНЫЕ КУРСЫ
СТРОИТЕЛЬНЫХ ДЕСЯТНИКОВ
РОСТОВ-ДОН, Сенная, 24 П
Проспект высылается по первому требованию

ПАТРАБУЕЦЦА
МЭХАНІЧНЫ РАТАТАР
фірмы «РОНЕО».
Унівэрсытэцкая, 16, гадзё-унівэрсытэт, тэлеф. № 16-83.

ПАТРАБУЕЦЦА
ПАКОВАЧНАЕ ЖАЛЕЗА,
Зварачацца да заг. гаспад. друкарні газэты «ЗЬВЯЗДА», Савецкая, 63.

Згублены бумажнік з дакументамі, розными квіткамі і грашыма. Знайшоўшага просяць зьвярнуць за ўзнагароду на імя Саланевіча Я. С. у канцылярыю пэдфаку ВДУ.

Прыблудзіўся САБАКА АЎЧАРКА. Адрас: 2-гі Штыльвы завулак д. № 8, кв. 6. Пасьля 3-х дзён лічу сваім.

Друкарня газ. «Зьвязда», Менск.
Менск. Галоўлітбел 337.